Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

142 (5816) | 22 чэрвеня 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

*Пераможнае завяршэнне гераічнага беспасадачнага пералёту Герояў Совецкага Саюза Чкалава, Байдукова і Белякова па маршруту Масква—Паўночны Полюс —Паўночная Амерыка выклікае зачараванне і любоў працоўных БССР.*

*Самалёты, пілатуемыя т.т. Вадап'янавым, Молакавым, Алексеевым і Галовіным, прыляцелі ў Архангельск*

*За выдатнае выкананне дзяржаўных заданняў па ўмацаванню абароннай магутнасці Совецкага Саюза і праяўлены ў гэтай справе гераізм 5 камандзірам Чырвонай Арміі прысвоена званне Героя Совецкага Саюза*

## ПАДРЫХТАВАНА СУСТРЭЦЬ УБОРКУ УРАДЖАЮ

Наступае самы адказны і напружаны ...рыяд сельскагаспадарчых работ. Праведеная сяўба — гэта толькі частка барацьбы за ўраджай. Пасеянае трэба даглядзець, захаваць і ўбраць без страт. Іменна ад гэтага зараз залежаць усе вынікі сельскагаспадарчага года, далейшае ўмацаванне калгасаў і павышэнне працадня калгасніка.

Наша партыя, наш урад акружаюць ...ключнымі клопатамі калгаснае сялянства, ствараюць усе ўмовы для росту большэвіцкай заможнасці калгасаў і калгаснікаў. Іменна аб гэтым гаворыць і прыняты па ўказанню таварыша Сталіна пастановы аб зніжэнні для калгасаў і адасобнікаў БССР норм абавязковых паставак зярна дзяржаве, натураплаты за работы МТС, спісанні з калгасаў запазычанасці па насеннай, харчовай ссудах.

У наяўнасці выключна спрыяючая перспектыва барацьбы за высокааплачаемы прададзень калгаснікаў, тым больш, што віды на ўраджай у гэтым годзе па ...іх раёнах рэспублікі добрыя. Справа, ...ачыць, толькі ў тым, як будзе рэалізавана гэтая перспектыва, у правільным кіраўніцтве і арганізацыі ўборкі, у добраякасным рабоце саміх калгаснікаў.

Таварыш Сталін гаворыць: «Каб стаць калгаснікам заможнымі, для гэтага патрэбуецца цяпер толькі адно — прадаваць калгасе чэсна, правільна выкарыстоўваць трактары і машыны, правільна выкарыстоўваць рабочую сілу, правільна апрацоўваць зямлю, берагчы калгасную ўласнасць».

Многа сельскагаспадарчых работ прыпадае на гэты перыяд: праполка, уборка ...нажаці, уздым папару, сіласаванне і падрыхтоўка да ўборкі зернавых, ільну т. д. Правільна спалучыць гэтыя работы, забяспечыць аператыўнае кіраўніцтва і — важная задача зямельных органаў, совецкіх і партыйных арганізацый.

Саўнарком БССР і ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 15 чэрвеня «Аб мерапрыемствах па догляду пасеваў і падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю» даў вычарпальныя і практычныя ўказанні совецкім, партыйным арганізацыям, дырэктарам МТС і саўгасаў па правядзенню ўсіх сельскагаспадарчых работ у рэспубліцы. Адзначаючы становішча сельскагаспадарчых работ сведчыць, што гэтае рашэнне СНК БССР і ЦК КП(б)Б недапушчальна дрэнна выконваецца ў большасці раёнаў рэспублікі.

Ход праполкі па рэспубліцы незадавальняючы. На 15 чэрвеня прапалота яравых толькі 67,7 проц., азімых —56.2 проц., ільну — у першы раз — 91,7 проц., у другі раз — 31,8 проц. Асабліва адстаюць па праполцы Сенненскі, Лёзнянскі, Шапанковіцкі, Мсціслаўскі і Уваравіцкі раёны.

Вельмі адстаюць па праполцы саўгасы сістэмы Наркомсоўгасаў і асабліва «Анцірава», Уллзенскага раёна, «Свабода», Дзержынскага раёна, «Спартак», Менскага раёна. Зусім не пачата праполка ў саўгасе «Чырвоны Кастрычнік», Чэрыкаўскага раёна.

Слабымі тэмпамі разгортваецца ўборка сена. На 15 чэрвеня скошана па рэспубліцы толькі 5,1 проц. натуральнай сенажаці. Між тым, ад своечасовай уборкі першага і другога ўкосу залежыць забеспячэнне на зіму добраякасным сенам жывёлы калгасаў і калгаснікаў. Яўна незадавальняюча праходзіць сіласаванне кармоў. План сіласавання на 15 чэрвеня выкананы толькі на 4 6 проц.

Запяжка праполкі, сенаўборкі і сіласавання адбіваецца і на ходзе падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю. Найбольш адстае падрыхтоўка сельскагаспадарчых машын і кадраў да іх.

Сельская гаспадарка нашай рэспублікі ў гэтым годзе, як ніколі, насычана машынамі. Гэта дае магчымасць пераважную большасць усіх работ па ўборцы правесці механізаваным спосабам. У гэтым годзе на сацыялістычных палях рэспублікі павінна працаваць 626 камбайнаў. Між тым, частка камбайнаў, якія працавалі ў мінулым годзе, няспраўная, а рамонт іх запягваецца. Па вестках Наркамзема, з 26 няспраўных камбайнаў па МТС адрамантавана толькі 4. Не адрамантаваны камбайны ў саўгасах імя Блюхера, «Комунар», «Чырвоны Кастрычнік». Белсельгасснаб да гэтага часу для камбайна «Комунар» не завёз ніякіх запасных частак.

З 225 трактараў па МТС, якім неабходзен капітальны і сярэдні рамонт, паступіла ў рамонт толькі 109. З сярэдняга рамонту выпушчана 26 трактараў. Трактарных малатарняў трэба адрамантаваць 1.692, адрамантавана 328. Па саўгасах з 209 няспраўных малатарняў адрамантавана толькі 19. Не лепш абстаіць справа і з рамонтам уборачных машын у саміх калгасах.

Рашаючае значэнне ў правядзенні ўборкі маюць кадры, якім будзе даверана работа на сельскагаспадарчых машынах. Аднак на сёнешні дзень ні ў Наркамземе БССР, ні ў Наркамаце саўгасаў няма поўнай яснасці становішча з кадрамі для работы на сельскагаспадарчых машынах. Не заняліся шчыльна гэтай справай і раённыя зямельныя аддзелы. Дрэнна пастаўлена падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў, дрэнна праверены кадры, якія ёсць.

Аб чым гаворыць гэтыя сур'ёзныя недахопы падрыхтоўкі да ўборкі? Аб тым, што з факта школьніцтва ў сельскай гаспадарцы рэспублікі з боку трацкісцкіх, правых, напыянал-фашысцкіх бандытаў, шпіёнаў і дыверсантаў органы Наркамзема, Наркомсоўгасаў і партыйныя арганізацыі не зрабілі яшчэ для сябе ўсіх вываданняў. Многа яшчэ балбатні існуе аб ліквідацыі вынікаў школьніцтва і мала сапраўднай напружанай работы ў гэтым напрамку. Нездавальняючым яшчэ застаецца кіраўніцтва совецкіх і зямельных органаў калгасамі.

Балбочуць аб ліквідацыі школьніцтва, займаюцца схаластычнымі размовамі, замест таго, каб зараз-жа, не марудзячы ні аднаго дня, прыняць усе меры для павышэння каштоўнасці працадня і рэнтабельнасці калгасаў і саўгасаў. Іменна гэта павінны ўлічыць нашы партыйныя і совецкія арганізацыі, калі яны жадаюць як можна хутчэй ліквідаваць вынікі школьніцтва і выкурыць з усіх шчылін ворагаў народу, якія сям-там яшчэ прытаіліся ў нашых зямельных органах, у калгасах і саўгасах.

У нас ёсць усе магчымасці, каб з поспехам справіцца з правядзеннем праполкі, уборкі сена, сіласавання і падрыхтоўкі да ўборкі зернавых.

Уздым творчай актыўнасці калгаснікаў і аднаасобнікаў у адказ на пастанову ўрада аб ільготах, разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва і рост стаханаўскага руху, у сувязі з падрыхтоўкай да ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі — вось у чым зарука паспяховага правядзення ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Партыйныя арганізацыі, узброеныя ўказаннямі таварыша Сталіна, рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і XVI з'езда большэвікоў Беларусі, павінны ўзначаліць новы вытворчы ўздым у калгасах, узмацніць кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і забяспечыць у гэтым годзе найбольшыя поспехі калгасаў рэспублікі і высокааплачваемы працадзень калгаснікам.

## АБ ПРЫСВАЕННІ ЗВАННЯ ГЕРОЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА КАМАНДЗІРАМ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

### ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР пастанаўляе:

За ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў урада па ўмацаванню абароннай магутнасці Совецкага Саюза і праяўлены ў гэтай справе гераізм прысвоіць званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна:

1. Камкору **Смушкевічу, Якаву Владзіміравічу.**
2. Камкору **Паўлаву, Дзмітрыю Грыгор'евічу.**
3. Камдзіву **Петрову, Міхаілу Петровічу.**
4. Палкоўніку **Копец, Івану Іванавічу.**
5. Маёру **Праскураву, Івану Іосіфавічу.**

**Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР**
**М. КАЛІНІН.**

**Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР**
**І. АКУЛАЎ.**

Масква, Крэмль.
21 чэрвеня 1937 г.

## УЗНАГАРОДЖАННЕ КАМАНДЗІРАЎ, ПАЛІТРАБОТНІКАЎ, ІНЖЫНЕРАЎ І ТЭХНІКАЎ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

За выдатныя поспехі ў баявой, палітычнай і тэхнічнай падрыхтоўцы злучэнняў, часцей і падраздзяленняў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР узнагаразіў 90 камандзіраў, палітработнікаў, інжынераў і тэхнікаў ордэнамі Саюза.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны 4 чалавекі: камдзіў Штэрн Г. М., дывізійны камісар Гальцаў І. С., палкоўнік Пакошчнікаў А. І., маёр Галіц І. І.

Ордэнам Чырвоны Сцяг узнагароджана 60 чалавек.

Ордэнам Чырвоная Звязда ўзнагароджана 26 чалавек. (БЕЛТА).

## ПАЎНОЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ У АРХАНГЕЛЬСКУ

Учора ў Галоўным кіраўніцтве Паўночнага морскага шляху ад начальніка экспедыцыі на Паўночны полюс О. Ю. Шміта атрымана радыёграма, якая паведамляе, што самалёты, пілатуемыя Вадап'янавым, Молакавым, Алексеевым і Галавіным, 21 чэрвеня ў 11 гадзін 29 мінут раніцы вылецелі з Амэрмы. Самалёты ўзялі накірамак на Архангельск.

***

У 18 г. 15 м. выдатна селі на пядрыхтаваным пад Архангельскам аэрадроме на Княжэвостраве. Цёпла, кветкі, сочная зялёная трава. Радасныя твары сустракаючых і радасць у нас саміх.

**ШМІДТ.**

## НОВАЯ БЛІСКУЧАЯ ПЕРАМОГА СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ



Героі Совецкага Саюза тт. Чкалаў, Байдукоў і Белякоў, завяршыўшыя беспасадачны пералёт па маршруту Масква—Паўночны полюс — Паўночная Амерыка.

### ГАНАРЫМСЯ ВАШЫМ ПОДВІГАМ

**Героям Совецкага Саюза В. П. Чкалаву Г. Ф. Байдукову, А. В. Белякову**

**ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!**

Ленінскі комсамол, уся совецкая моладзь бязмерна захоплены вашым подвігам. Вы ўзялі штурмам полюс непрыступнасці, гэту крэпасць ледзянога бязмоўя, якая да гэтага часу была недасягальнай для чалавека. Вы пралажылі найкарацейшы шлях паміж двума вялікімі краінамі. Вы яшчэ раз праславілі ва ўсім свеце сілу і магутнасць совецкага народу, нашай вялікай сацыялістычнай радзімы.

З найвялікшай удзячнасцю юнакі і дзяўчаты нашай краіны зварачаюцца да вашага прыкладу, здзіўляючага спалучэння мужнасці і настойлівасці з глыбінёй ведаў і майстэрстам. Совецкая моладзь, натхняемая вашым подвігам, поўна гатоўнасці сваёй працай і доблесцю праславіць магутнасць сваёй бацькаўшчыны і непахісна следаваць па любому маршруту, які ўкажа наш вялікі правадыр і настаўнік таварыш **Сталін.**

**Сакратар ЦК ВЛКСМ А. КОСАРЭЎ.**

*МАСКВА*

## Таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Кагановічу, Калініну, Жданаву, Ежову, Мікаяну, Андрэеву

*З Портланда, 21 чэрвеня.*

Бязмерна шчаслівы, атрымаўшы ваша прывітанне, і рады разам з вамі і сваім народам чарговай перамозе совецкай авіяцыі. Сталінскі маршрут прадоўжан. Заданне свайго ўрада мы выканалі, не гледзячы на выключна складаныя затрудненні, звязаныя з палётам.

Выключная настойлівасць у нас выпрацавана большэвіцкай партыяй і правадыром народаў таварышам Сталіным.

Сардэчнае дзякуй за моцнае большэвіцкае выхаванне, якое садзейнічала чарговай перамозе.

Моцна паціскаем вашы рукі і яшчэ раз дзякуем таварышу Сталіну за ўвагу і бацькоўскія клопаты аб нашым экіпажу.

Цябе, таварыш Сталін, мы ўспаміналі заўсёды і асабліва ў цяжкія мінуты, і гэта ва многім дапамагала нам змагацца з перашкодамі і перамагаць.

Экіпаж здароў і гатоў да новых заданняў свайго ўрада.

Жадаем вам таксама здароўя, новых поспехаў.

**ЧКАЛАЎ, БАЙДУКОЎ, БЕЛЯКОЎ.**

## Прывітанне прэзідыума Выканкома Комінтэрна героям-лётчыкам

**ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АМЕРЫКІ — Гор. ПОРТЛАНД**
**ЭКІПАЖУ САМАЛЁТА «АНТ-25» ЧКАЛАВУ, БАЙДУКОВУ, БЕЛЯКОВУ.**

Ваш непараўнаны па адвазе і майстэрству беспасадачны пералёт Масква—Паўночны полюс — ЗША сустракаецца з энтузіязмам і глыбокім захапленнем працоўнымі ўсяго свету. Гэта бліскучая перамога, якая дэманструе магутнасць Совецкага Саюза і веліч партыі Леніна—Сталіна, выхаваўшай такіх мужных лётчыкаў, бясстрашных заваявальнікаў нязведаных паветраных прасторaў, натхніць мільёны барацьбітоў на яшчэ больш рашучую барацьбу супроць цёмных сіл рэакцыі і фашызма і захватніцкіх войн, супроць злачынай фашысцкай інтэрвенцыі ў Іспаніі, яшчэ больш умацуе веру прапоўных у канчатковую перамогу. Ваш пералёт паказвае свету, якія бліскучыя магчымасці перамогі чалавека над прыродай дае сацыялістычны лад.

Брацкае прывітанне, дарагія таварышы!

**Ад імя Комуністычнага Інтэрнацыянала**
**Дзімітраў**
**Эрколі**
**Мануільскі**
**Марці**
**Пік**
**Куусінен**
**Готвальд**
**Флорын**
**Масквін М. А.**
**Ван Мін.**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ УРАДАВАЙ КАМІСІІ

### ПА АРГАНІЗАЦЫІ БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЁТУ МАСКВА—ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС—ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА

Заданне таварыша **Сталіна**, урада СССР выканана: бяспрыкладны ў гісторыі беспасадачны пералёт Масква—Паўночны полюс — Паўночная Амерыка завершан. Ажыццявілася мара чалавецтва.

Гераічны экіпаж самалёта «АНТ-25» у складзе Герояў Совецкага Саюза тт. **Чкалава, Байдукова і Белякова**, вылецеўшы 18 чэрвеня г.г. у 4 гадзіны 05 мінут па маскоўскаму часу з Шчолкаўскага аэрадрома (каля Масквы), праляцеў па наступнаму маршруту:

Масква — Онега — Белае мора — Кольскі поўвостраў — Барэнцава мора — Зямля Франца-Іосіфа — Паўночны Полюс — Ледавіты акіян (Полюс непрыступнасці) — востраў Патрыка — мыс Пірс Пойнт (паўночнае ўзбярэжжа Канады) — перасек Канаду (форт Сімпсон, штат Альберта, Брытанская Калумбія). Экіпаж прыняў рашэнне перасячы тут Скалістыя горы і вышаў на ўзбярэжжа Ціхага акіяна; прайшоў да заліва Тылемук (штат Орэгон), вышаў на тэрыторыю ЗША і 20 чэрвеня, у 19 гадзін 30 мінут па маскоўскаму часу зрабіў пасадку на аэрадроме Баракс, каля Портланда (штат Вашынгтон).

Самалёт быў у паветры 63 гадзіны 25 мінут. За гэты час пройдзена звыш 10 тысяч кілометраў земнага шляху і 12 тыс. кілометраў паветранага шляху. Самалёт прайшоў над акіянамі і ільдамі 5.900 клм. Вышыня палёту ў большай частцы шляху, з-за воблачнасці і дрэннага надвор'я, была 4.000 метраў і вышэй.

Самалёт вылецеў са Шчолкаўскага аэрадрома пры добрым надвор'і, якое трымалася да г. Онегі. Тут самалёт сустрэў навальнічны і дажджавы фронт і прайшоў яго сляпым палётам. Да шыраты 72 градусы палёт ішоў вышэй воблакаў. На шыраце ў 72 градусы экіпаж сустрэў цыклон і рашыў абходзіць яго з усходу. Абход пягнуўся да Зямлі Франца Іосіфа. аднак, цыклон абысці не прадставілася магчымым, і экіпаж прабіўся праз яго сляпым палётам на вышыні 4.080 метраў. З цыклона самалёт вышаў толькі за Паўночным полюсам. У далейшым да ракі Мэкензі надвор'е было здавальняючым. На рацэ Мэкензі экіпажу прышлося яшчэ раз праходзіць праз цыклон. Пераваліўшы на вялікай вышыні праз хрыбет Скалістых гор і вышаўшы на ўзбярэжжа Ціхага акіяна, самалёт папаў у раён штормавага надвор'я з вялікімі сустрэчнымі ветрамі.

Выключнае майстэрства, большэвіцкую адвагу і мужнасць праявіў выдатны экіпаж, які выканаў сапраўды бліскуча найвялікшы ў гісторыі пералёт, заваяваўшы самую суровую, труднейшую частку земнага шара, адкрыўшы новую эру заваявання чалавекам прыроды.

**УРАДАВАЯ КАМІСІЯ ПА АРГАНІЗАЦЫІ БЕСПАСАДАЧНАГА ПЕРАЛЁТУ.**

## ГЕРОІ АБ СВАІМ ПАЛЁЦЕ

**МАСКВА — ТАСС**

**НЬЮ-ЙОРК** (буйнейшы цэнтр ЗША), 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Героі Совецкага Саюза Чкалаў, Байдукоў і Белякоў перадалі з Ванкувера ТАСС'у наступную заяву:

«20 чэрвеня 1937 года мы закончылі пералёт з СССР у ЗША на самалёце «АНТ-25». Пасадку зрабілі ў штаце Вашынгтон на аэрадроме Баракс каля горада Портланда. Дарога была нялёгкая. Дрэннае надвор'е ў выглядзе магутных высокіх воблакаў сустракалася неаднаразова. Іх трэба было абходзіць. Таму шлях падаўжаўся на сотні кілометраў. Самалёт абледзянеў часткова ў Барэнцавым моры.

Шлем прывітанне працоўным Совецкага Саюза.

**ЧКАЛАЎ, БАЙДУКОЎ, БЕЛЯКОЎ».**

## АБМЕН ПІСЬМАМІ ПАМІЖ тав. ЛІТВІНАВЫМ І п. ГЕНДЭРСОНАМ У СУВЯЗІ З ПЕРАЛЁТАМ ГЕРОЯЎ СОВЕЦКАГА САЮЗА

На імя народнага камісара замежных спраў М. М. Літвінава ўчора, 21 чэрвеня, паступіла ў сувязі з пералётам Герояў Совецкага Саюза пісьмо ад п. Гендэрсона, паверанага ў справах ЗША ў СССР, у якім гаворыцца:

«Спяшу праз Вас перадаць совецкаму ўраду і ўдзельнікам гэтага подвіга, які робіць эпоху, сардэчнейшае віншаванне ад урада і народа Злучаных Штатаў і ад пасольства.

Вопыт і смеласць пілотаў, прадэманстраваная настойлівасць і надзейнасць самалёта і арганізацыйная здольнасць асоб, плануючых палёт, выклікалі захапленне ўсяго амерыканскага народа».

У сваім адказе тав. Літвінаў просіць Гендэрсона перадаць ураду і народу Злучаных Штатаў шчырую падзяку за праяўленыя пачуцці. Адзначыўшы, што ўстанаўленне паветранай сувязі паміж нашымі двума краінамі створыць новае звяно культурнай сувязі паміж імі, тав. Літвінаў просіць п. Гендэрсона перадаць ураду ЗША падзяку ад Совецкага ўрада за вельмі каштоўную дапамогу, аказаную лётчыкам амерыканскімі метэаралагічнымі станцыямі і іншымі ўстановамі, і за іх садзейнасць поспеху пералёту.

(БЕЛТА).

## ВАШЫНГТОН, ПАЎПРЭДУ СССР,

## ДЛЯ ЧКАЛАВА, БЕЛЯКОВА, БАЙДУКОВА

Прыміце і ад мяне гарачае віншаванне з завершаным подвігам. Вамі на праву ганарыцца наша партыя і совецкая краіна, але можа ганарыцца ўсё чалавецтва. У момант, калі вынаходства чалавечага духа — авіяцыя скарыстоўваецца некаторымі краінамі, якія лічаць сябе еўрапейскімі, для знішчэння гарадоў, вёсак, забойства мужчын жанчын і дзяцей у мэтах навязвання народу другой еўрапейскай краіны чуждых яму рэжыма і ідэалогіі, ваша геройскае дасягненне паказвае ў які бок накіраваны думкі і намаганні міралюбівых народаў Совецкага Саюза.

Акрамя таго, рад, што, злучыўшы паветранай лініяй праз полюс абодва поўшар'і і праклаўшы новую дарогу з Саюза ў ЗША, вы стварылі новую культурную сувязь і глебу для каштоўнага спаборніцтва паміж народамі Совецкага Саюза і амерыканскім народам, які таксама можа ганарыцца сваімі бліскучымі дасягненнямі ў галіне авіяцыі і палярных даследванняў.

**ЛІТВІНАЎ.**

## ВОДГУКІ ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ НА ПЕРАЛЁТ МАСКВА—ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС—ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА

**ШВЕЦЫЯ**

СТАКГОЛЬМ, 20 чэрвеня (БЕЛТА). Шведская грамадскасць з напружанай цікавасцю сочыць за палётам герояў Совецкага Саюза тт. Чкалава, Байдукова і Белякова па маршруту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка Усе газеты апублікавалі паведамленне аб пералёце, адзначаючы як буйнейшае дасягненне сляпы палёт на вышыні звыш чатырох тысяч метраў.

**ЗША**

НЬЮ-ЙОРК, 20 чэрвеня (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд прэс з Лос-Анжэлоса, вядомы амерыканскі лётчык Джэмс Матэрн заявіў, што ён захапляецца совецкімі лётчыкамі і збіраецца неадкладна адправіцца для іх сустрэчы. Ён заявіў далей, што вельмі рад вітаць совецкіх лётчыкаў, асабліва Белякова. «Совецкі ўрад, — сказаў Матэрн, — паслаў Белякова ратаваць мяне, калі я папярпеў аварыю на совецкай тэрыторыі ў 1933 годзе, прабуючы ажыццявіць кругасветны палёт». У заключэнне ён дадаў, што совецкі самалёт павінен быць выдатным.

**ТУРЦЫЯ**

АНКАРА, 20 чэрвеня. (БЕЛТА). Паведамленні аб беспасадачным палёце совецкіх лётчыкаў Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка сустрэты ў Анкары з велізарнай цікавасцю. Прадстаўнікі турэцкага друку ў гутарцы з карэспандэнтам ТАСС выразілі сваё захапленне дасягненнямі совецкай авіяцыі, якая толькі-што зазаявала Паўночны полюс і ўжо робіць гэты сусветнага значэння пералёт. Тут усе з непярпеннем чакаюць вестак аб шчаслівым заканчэнні пералёту.

## ТЭЛЕГРАМА ПРЭЗІДЭНТА РУЗВЕЛЬТА

ВАШЫНГТОН (сталіца ЗША), 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Прэзідэнт ЗША Рузвельт тэлеграфаваў паўпрэду СССР у ЗША Траяноўскаму: «Я даведаўся з найвялікшым задавальненнем аб паспяховым завяршэнні першага беспасадачнага пералёту з Совецкага Саюза ў Злучаныя Штаты. Майстэрства і смеласць трох совецкіх лётчыкаў, якія так бліскуча выканалі гістарычны подвіг, заслугоўвае найвялікшай пахвалы Прашу вас перадаць ім мае самыя гарачыя віншаванні».

# Краіна вітае сталінскіх пітомцаў—мужных, бясстрашных лётчыкаў, герояў гістарычнага пералёту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка

## ГОРДЫЯ АРЛЫ НАШАЙ РАДЗІМЫ

ВІЦЕБСК. З невыказнай радасцю прапоўныя горада сустрэлі перададную па радыё вестку аб зазяршэнні беспасадачнага пералёту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка. У час абедзеных перапынкаў на прадпрыемствах праводзяцца чыткі газет з матэрыяламі аб пералёце.

На заводзе «Чырвоны металіст» імя Кірава 21 чэрвеня адбыўся агульны сход рабочых.

— Я закончыў без адрыву ад вытворчасці лётную школу,—кажа стаханавец-комсамолец Бялезіч.—Вучобу буду працягваць далей. Аддам усе свае сілы і здольнасці, каб быць такім, як нашы слаўныя Героі Чкалаў, Байдукоў і Белякоў.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі рабочыя пішуць:

— З хвалявэннем мы сачылі за палётам паветранага карабля «АНТ-25», на якім нашы адважныя лётчыкі зрабілі бясприкладны ў гісторыі пералёт праз палярныя пустыні, праз горы і вечныя ільды да берагоў Ціхага акіяна ў Паўночную Амерыку. Пералёт закончан. Сталінскае заданне выканана. Гордыя сокалы Краіны Саветаў упершыню пралажылі прамую паветраную лінію паміж СССР і Амерыкай.

Гэта новае дасягненне совецкай авіяцыі натхняе нас на новыя перамогі, на лепшую работу на ўсіх участках.

Прывітанне сталінскім пітомцам, гордым арлам нашай радзімы.

Няхай жыве арганізатар і натхніцель перамог таварыш Сталін!

***

МАГІЛЕЎ. Небывалы ў гісторыі чалавецтва пералёт Герояў Совецкага Саюза, стаўшых Героямі ўсяго свету,—Чкалава, Белякова і Байдукова—прыкаваў да сябе ўвагу працоўных. На вуліцах горада каля радыёрупараў—натоўп людзей. У газетных кіёсках з самай раніцы нарасхват разбіраюцца газеты.

З неапісальнай радасцю сустрэлі рабочыя і калгаснікі Магілеўшчыны паведамленне аб паспяховым завяршэнні пералёту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка і ўдалай пасадцы паветранага карабля «АНТ-25».

У чырвоных кутках рымарнай фабрыкі праводзяцца чыткі газет і гутаркі аб пералёце. Тут на геаграфічнай карце паказан маршрут пералёту. Каля карты збіраецца многа рабочых, каб больш дэтальна азнаёміцца з трасай пералёту. Стаханавец фабрыкі тав. Гарэлік у часе гутаркі заявіў:

— Наша авіяцыя і яе слаўныя лётчыкі робяць адно пуда за другім. Яшчэ не паспелі прыляцець самалёты з экспедыцыі на Паўночны полюс, як нашы Героі на нашых совецкіх машынах зрабілі зноў нябачны ў гісторыі пералёт. Нашы лётчыкі паказалі, на якія подвігі яны здольны. Мы ганарымся сваёй авіяцыяй і сталінскімі лётчыкамі. (БЕЛТА).

## СТАЛІНСКАГА ПЛЕМЕНІ СЫНЫ

Над пустыняй мёртвай, ледзяною,
Шлях праклалі казачны яны—
Слаўныя, адважныя Героі,
Сталінскага племені сыны.
Праляцелі першыя дарогай
На ўсёй гісторыі вякоў,
З большэвіцкім сцягам перамогі —
Чкалаў, Байдукоў і Белякоў.
І сынамі смелымі такімі,
Што злучылі светаў берагі,
Ганарыцца любая радзіма,
Ганарыцца Сталін дарагі.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА.

21 чэрвеня 1937 г.

## БОЛЬШЭВІЦКАЙ ВОЛІ НЯМА ПЕРАШКОД!

Акадэмія навук БССР шле гарачае прывітанне гераічным выканаўцам гістарычнага сталінскага задання, якія зрабілі бесспрыкладны трансарктычны пералёт, тт. Чкалаву, Байдукову і Белякову. Ваш подвіг даў свету яшчэ адзін доказ магутнасці нашай сацыялістычнай радзімы, паказаў, што няма перашкод, якіх не магла-б перамагчы большэвіцкая воля і вытрыманасць, што няма вяршынь, якіх не магла-б дасягнуць совецкая навука і тэхніка.

Няхай жывуць сталінскія выхаванцы, слаўныя сыны вялікага совецкага народу, Героі Совецкага Саюза тт. Чкалаў, Байдукоў і Белякоў!

Няхай жыве арганізатар і натхніцель нашых перамог — Усесаюзная комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве правадыр народаў вялікі Сталін!

**Прэзідыум Акадэміі навук БССР—акадэміка: СУРТА, КОЛАС, ВАЛЬФСОН, ПАНКЕВІЧ, БУРСТЫН, АФАНАСЬЕЎ.**

## НАША КРАІНА—КРАІНА ПЕРАМОГ

Зараз мы з'яўляемся сведкамі небыталых у свеце новых перамог нашай совецкай краіны. На нашых совецкіх самалётах даставілі экспедыцыю на Паўночны полюс, якая і зараз прадаўжае весці там навукозыя наглядання на карысць чалавецтва. Цяпер мы атрымалі радаснае паведамленне аб тым, што Героі Совецкага Саюза — Чкалаў, Байдукоў, Белякоў, гордыя сокалы сталінскай эпохі — зрабілі небывалы ў свеце пералёт на самалёце, пабудаваным на нашых совецкіх заводах і з нашых айчынных матэрыялаў.

Кожнае новае дасягненне, кожная новая перамога дасягаецца ў нас таму, што мы бязмежна любім нашу радзіму. Кожная перамога натхняе нас на яшчэ лепшую работу.

Так і хочацца ва ўвесь голас, ад душы крыкнуць, каб нашы таварышы Чкалаў, Байдукоў, Белякоў пачулі там, у Амерыцы, што мы ўвесь час з напружаннем сачылі за іх палётам. Тут у сябе з непярлівасцю чакаем даклада аб выпуску пазыкі абароны, пазыкі далейшага ўмацавання магутнасці СССР.

**П. В. ЗІНАЎ.**

**Машыніст-стаханавец паравознага дэпо, Менск, Заходняй чыгункі.**

## СЛАВА БЯССТРАШНЫМ ГЕРОЯМ!

Не так даўно на ўвесь свет прагрымела выдатная перамога нашых слаўных палярнікаў і лётчыкаў на чале з «лёдавым капітанам» О. Ю. Шмідтам, якія заваявалі Паўночны полюс. І вось зараз увесь свет зноў у захапленні: Героі Совецкага Саюза Чкалаў, Байдукоў і Белякоў зрабілі бясприкладны ў гісторыі беспасадачны пералёт Масква — Паўночны полюс — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Нашы сэрцы напоўніліся радасцю і гордасцю, калі мы даведаліся аб гэтым новым геройскім подвігу нашых выдатных лётчыкаў — гордых сокалаў.

Мы ні на хвіліну не сумняваліся ў паспяховым завяршэнні пералёту, бо яго рабілі бясстрашныя Героі, мужныя совецкія лётчыкі, у якіх смеласць і адвага спалучаны з выдатнымі ведамі.

Чкалаў, Байдукоў і Белякоў — сталінскія пітомцы, і, робячы свой пералёт, яны выконвалі заданне таварыша Сталіна, заданне партыі і ўрада. Іх подвіг натхняе нас на яшчэ лепшую работу на яшчэ большае ўмацаванне абароназдольнасці нашай радзімы, на тое, каб ператварыць нашу фабрыку ў непрыступную крэпасць абароны.

Шчасліва наша радзіма, маючы такіх Герояў. І шчаслівы нашы Героі, маючы такую радзіму.

Слава бесстрашным Героям!

**КІСЕЛЬ А. С.,**
**ДЯПЛІЦКАЯ С. С.**
**Ордэнаносцы менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік».**

## МЫ ГАНАРЫМСЯ ІМІ

Пачуццё хвалявання і вялікай радасці выклікаюць Героі Совецкага Саюза Чкалаў, Байдукоў і Белякоў сваім бліскучым нечуваным у гісторыі чалавецтва пералётам па сталінскаму маршруту — Масква — Паўночны полюс — Паўночная Амерыка.

Гэта бліскучая перамога совецкай авіяцыі ўсяляе прыліў гонару за сваю радзіму, новы ўздым совецкага патрыятызма і ўпэўненасць у непарушнасці свяшчэнных граніц СССР. Гэта пра іх — сталінскіх пітомцаў, такіх як Чкалаў, Байдукоў і Белякоў, сказана ў песні:

«И сталинским детям борьбы и труда
Ни трусость, ни страх непонятны.
Мы знаем что с ними везде и всегда
Сердце нашей родины всей необ'ятной».

**Кампазітар І. ЛЮБАН.**

### ПЕРАЛЁТ НАС НАТХНЯЕ НА СТВАРЭННЕ НОВЫХ ПЕСЕНЬ

З пачуццём вялікага хвалявання мы прачыталі аб новай перамозе нашых сталінскіх пілотаў — Чкалава, Байдукова і Белякова. Гэты пералёт адкрывае новыя магчымасці зносін паміж Еўропай і Амерыкай і з'яўляецца пачаткам новай эры авіяцыйнага майстэрства. Толькі ва ўмовах нашай сацыялістычнай радзімы змаглі вырасці і выхоўвацца крылатыя сталінскія арлы. Нас, совецкіх кампазітараў, гэта павінна натхніць на стварэнне новых песень і буйных манументальных твораў, адлюстроўваючых герояў нашай сацыялістычнай радзімы.

**Кампазітары А. ТУРАНКОЎ, А. БАГАТЫРОЎ.**

### МАРЫ СТАЛІ САПРАЎДНАСЦЮ

Рокат совецкага матора абудзіў нязведаныя прасторы Арктыкі. Упершыню ў гісторыі чалавецтва найлепшыя мары эпох і пакаленняў ператварыліся ў жывую і рэальную рэчаіснасць: скарочаны шляхі паміж далёкімі матэрыкамі, пераможаны ледзяныя пустыні Паўночнага акіяна.

Яны, адважныя і мужныя, тры дастойных сыны вялікай радзімы, уславілі перамогай свой народ, сваю дзяржаву. Іх чырвоныя крыллі, узброеныя совецкай тэхнікай, падтрыманыя гераізмам, спэментаваныя гарачай любоўю мільёнаў працоўных, паказалі ўсю веліч нашай радзімы, яе несакрушальную магутнасць, яе жалезную волю да перамог, яе невычарпальную сталінскую энергію.

Слава крылатым героям!

**МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.**

## НА ТРАСЕ ПЕРАЛЁТУ

### ШТО ТАКОЕ ПОЛЮС НЕПРЫСТУПНАСЦІ?

19 чэрвеня раніцай у сваёй радыёграме таварышу Сталіну ўдзельнікі трансарктычнага пералёту на самалёце «АНТ-25» паведамілі, што яны ідуць «над полюсам непрыступнасці». Што-ж такое полюс непрыступнасці або, як яго яшчэ завуць, полюс недаступнасці?

Даследчыкі палярных абласцей, набліжаючыся паступова да Паўночнага полюса, усё глыбей і глыбей пранікалі з розных старон у Арктычную і Антарктычную пустыні. Гэта пранікненне чалавека ў недаследваныя краіны адбывалася няроўнамерна. Белая пляма на карце поўшар'яў скарачалася больш з боку Еўропы, чым з боку Амерыкі. Такім чынам, цэнтр гэтай белай плямы адсоўваўся ад Паўночнага полюса, спускаючыся ў больш нізкія шыроты ў Заходнім поўшар'і. Цэнтр белай плямы для кожнага пэўнага моманту і з'яўляецца так званым полюсам непрыступнасці. Полюс гэты ляжыць у гарыстай ледзяной пустыні Паўночнага Ледавітага акіяна сярод хаатычна награмаджаных ільдоў. Ніхто з людзей тут яшчэ не бываў. Нават самалёты і інш. лятальныя апараты ніколі не праносіліся да гэтага часу над гэтымі месцамі.

Такім чынам, упершыню ў гісторыі чалавецтва адважныя совецкія лётчыкі пралажылі паветраны шлях над той часткай Паўночнага Ледавітага акіяна, якая дагэтуль была недаступнай і абазначалася на картах, як невядомая вобласць.

### ЧАМУ ЗА ПОЛЮСАМ ЗМЯНЯЕЦЦА ЛІЧЭННЕ ЧАСУ

Пакуль «АНТ-25» ляціць у нашым, Усходнім поўшар'і, экіпаж яго вядзе лічэнне часу па Маскве. Гэты паясны час аднолькавы і для Севастопаля і для Архангельска, г. зн. для ўсіх месц, якія ляжаць к поўдню і поўначы ад Масквы. Гэта час аднаго і таго-ж пояса часу.

Пераляцеўшы праз Паўночны полюс у Заходняе поўшар'е, самалёт папаў у другі пояс часу, дзе ён вылічаецца па іншаму мерыдыяну.

Пакуль самалёт знаходзіцца ў каляпалярнай вобласці, за так званым Палярным кругам, дзе зараз сонца не заходзіць на працягу цэлых сутак, дзень аставаўся днём. Але ніжэй 66,5 градусаў паўночн шыраты па таму-ж самаму напрамку, якому самалёт накіраваўся з Масквы, ужо ноч, у той час як у Маскве — дзе Справа ў тым, што гэта процілеглыя пу ты земнага шара, значыць, час тут адр ніваецца ад часу Масквы роўна на п сутак. Усё гэта вельмі добра можна пра чыць на глобусе.

Паміж Амерыкай і Азіяй, праз Вял акіян праходзіць так званая граніца д лінія, якая пазбяляе два суседніх дні. гэтай лініі пачынаецца лічэнне новага д Гэты новы дзень пачынаецца спачатку Камчатцы, на Далёкім Усходзе. Па ме вярчэння Зямлі, наступае новы дзень больш заходніх месцах — у Томс Свердлоўску, Маскве, Лондане, Нью-Ёр Сан-Францыска. Але тым часам на Далё Усходзе ўжо заканчваецца дзень, які ч чаўся 20 з лішнім гадзін назад. І к сонца для гэтых месц земнага шара да гае такога-ж становішча што і за су раней, тут пачынаецца новы дзень, у ч час як у больш заходніх месцах яшчэ канчаўся папярэдні.

Ідучы праз Паўночны полюс, сама перанёсся ў гэты ўчарашні дзень. У ч час як у Маскве, дапусцім, была поўнач прама процілеглай частцы зямлі. бу час, блізкі да поўдня, і пры тым таго д які ў Маскве ўжо канчаўся.

### ЯК ВЫЛІЧАЮЦЦА ШЫРОТЫ ЗА ПАЎНОЧНЫМ ПОЛЮСАМ

Па меры набліжэння ад Масквы да полюса самалёт падымаўся ў больш вы кія шыроты. Як вядома, лічэнне паралельных кругоў (шырот) пачынаецца ад экв тара. Найбольшы з паралельных кругоў плоскасці якіх рассякаюць земны ш перпендыкулярна асі вярчэння зям якая дзеліць земны шар папалам, зазе ца экватарам. Ад экватара і налічаюц паралельныя кругі да поўначы і поўд (90 градусаў — гэта полюс). Пераляце шы праз Паўночны полюс, самалёт ляці праз шыроты, лічэнне якіх ідзе ўжо полюса да экватара, г. зн. ад 90 град саў да 0.

**В. А. ШЫШАКОЎ.**

**Заг. абсерваторыі Маскоўскага пл нетарыя.**

### ГУТАРКА ВЯЛАСЯ ПРАЗ МЕНСК

20 чэрвеня, ледзь толькі Герой Совецкага Саюза тав. Чкалаў пасадзіў самалёт «АНТ-25» на аэрадроме Баракс у штаце Вашынгтон, народны камісар сувязі СССР тав. Халепскі ўстанавіў з Масквы радыётэлефонную сувязь з самалётам і правёў першую гутарку з яго гераічным экіпажам. Сувязь была забяспечана праз тэл фонны ланцуг Масква—Менск—Варшава-Парыж—Лондан. У Менску бесперабойну сувязь забяспечылі дзяжурныя тэхні апаратнай міжгароднай станцыі тт. Рам ненка і Інголь.

## СТАЛІНСКІ МАРШРУТ ПРАДОЎЖАН

**Г. БАЙДУКОЎ**
**Герой Совецкага Саюза.**

Выдатнай рысай людзей нашай вялікай краіны трэба лічыць здольнасць не супакойвацца на дасягнутым, імкненне пасля кожнай перамогі дабівацца ажыццяўлення новых замыслаў, новых дасягненняў.

1936 год для нашага экіпажа быў шчаслівым годам правядзення ў жыццё Сталінскага маршрута, вялікай перамогі совецкай авіяцыі. Пасля шматлікіх мітынгаў, гутарак і сустрэч з народам сваёй радзімы экіпаж зноў, як і раней, стаў на сваю любімую радавую работу. Ніякага зазнайства і самасупакаення экіпаж не дапускаў у сваёй штодзённай рабоце. Я параней шаму штодзенна выпрабоўваў новыя балвыя самалёты. Валерый Чкалаў займаўся тым-жа па суседству, а Саша Белякоў, як заўсёды, з дня ў дзень настойліва навучаў армію штурманаў майстэрству ваджэння караблёў на цэль, на галовы будучага праціўніка.

Прайшла зіма, і зноў нашы сэрцы і мыслі пацягнуліся да бясконцых прастораў паветранага акіяна, да вольных і далёкіх ільдоў Арктыкі, якія яшчэ ў мінулым годзе праплывалі пад крылом легендарнага «АНТ-25».

Мы з Валерыем часта гутарылі па душах да позняй ночы, не ўзбуджаючы асаблівых падазрэнняў у сваіх жонак і дзяцей. Зімой яшчэ некалькі разоў ездзілі на аэрадром у ЦАГІ, дзе стаяў наш «АНТ-25». Ляталі на ім. Трымалі параду з нашымі прыяцелямі — інжынерам Стоманам і тэхнікам Берднікам з поваду матора і самалёта, пісалі дакладныя М. М. Кагановічу і Рухімовічу, і, нарэшце, рашылі адкрыць усе свае планы К. Е. Варашылаву, які нёпла нас заўсёды выслухоўваў і падтрымліваў. Тав. Варашылаў не раз даваў нам прыяцельскія парады, дапамагаў нам у вырашэнні нашай задачы.

Задача-ж у асноўным зводзілася да таго, каб дабіцца ад урада дазволу на палёт з Масквы ў Злучаныя Штаты Амерыкі праз Паўночны полюс на самалёце «АНТ-25». З Валерыем Чкалавым мы напісалі пісьмо таварышу Сталіну і з вусім зразумелым хваляваннем і напружаннем чакалі сталінскага адказу. У гэтыя-ж дні паветраныя караблі Вадап'янава, Молакава, Алексеева і Мазурука заканчвалі пад кіраўніцтвам Шмідта сваю найвялікшую па рызыцы і важнасці экспедыцыю па высадцы дэсанта на Паўночны полюс.

Умовы складваліся настолькі спрыяюча, што мы амаль былі ўпэўнены ў станоўчым вырашэнні нашай справы. Мімаволі ўспаміналася, як Іосіф Вісарыёнавіч гаварыў нам, калі мы аднаго разу былі ў яго ў гасцях, што ляцець у Амерыку праз полюс яшчэ рана. Патрэбна вывучыць Палярны басейн, раіў таварыш Сталін, і тады толькі прадпрымаць такі грандыёзны палёт. І цяпер умову, высунутую таварышам Сталіным, выканала экспедыцыя О. Ю. Шмідта, і мысленна мы больш ужо не бачылі пярэчанняў да палёту з боку дальнабачнага Іосіфа Вісарыёнавіча. Нарэшце гадзіны і дні тамлівага чакання прайшлі. Гэта было 25 мая. У гэты дзень, як і заўсёды, я лятаў. У 11 гадзін раніцы мяне расшукалі па аэрадроме і паведамілі аб выкліку да наркома абароны тав. Варашылава. Неадкладна прыбыў у наркамат, дзе застаў Чкалава і Леванеўскага. Адтуль мы накіраваліся ў Крэмль.

У 16 гадзін мы ўтраіх былі запрошаны ў кабінет таварыша Сталіна.

Як толькі ўвайшлі, Іосіф Вісарыёнавіч устаў з-за доўгага стала, за якім сядзелі тт. Молатаў, Варашылаў, Л. Кагановіч і Ежоў, і, ветліва ўсміхаючыся, пайшоў да нас насустрач.

Прывітаўшыся з тт. Молатавым, Варашылавым, Кагановічам і Ежовым, мы ўтраіх ўселіся на процілеглым канцы стала. Я прадаўжаў разглядваць стаяўшага ля стала Іосіфа Вісарыёнавіча, потым аглядзеў твары і знешнасць усіх астатніх таварышоў.

Астаючыся ўнутрана задаволеным за добрае агульнае становішча нашых кіраўнікоў партыі і ўрада, я, карыстаючыся зацішшам, аглянуўся па баках, разглядваючы кабінэт таварыша Сталіна. На пісьмовым стале я заўважыў маляль «АНТ-25», напэўна прыпадпесеную таварышу Сталіну пасля мінулагоднята пералёту. Не скрыю, што ў гэты момант шчасце і гордасць ахапілі мяне, стала неяк цяплэй і радасней ад сазнання, што мы — у коле вялікіх выдатных людзей нашай краіны.

Іосіф Вісарыёнавіч, паглядаючы на нас, з усмешкай запытаў:

— Што, зноў зямлі не хапае? Зноў сабіраецеся ляцець?

— Так, таварыш Сталін, — сказаў Чкалаў, — час падыходзіць, прышлі прасіць дазволу ўрада аб пералёце праз Паўночны полюс.

Усе сядзячыя за сталом глядзелі на нас і злёгку ўсміхаліся.

— Куды-ж вы сабіраецеся ляцець? Хто будзе з вас дакладваць? — зноў запытаў таварыш Сталін.

— Тут не адна група, таварыш Сталін, — заўважыў Клімент Ефрэмавіч і, весела падміг ваючы ў наш бок, дадаў, што тут толькі Байдукоў сядзіць на двух крэслах — яго і Леванеўскі просіць, і Чкалаў просіць у свой экіпаж.

— Ага, групіроўкі, — жартаўліва кінуў Іосіф Вісарыёнавіч і яшчэ раз уважліва агледзеў нас. Ну давайце, тав. Чкалаў.

Чкалаў спакойна расказаў нашы планы, прасіў дазволу на палёт на «АНТ-25» у Амерыку праз Паўночны полюс.

— Экіпаж — наша мінулагодняя тройка, — гаварыў Чкалаў, — гатоў да палёту, і самалёт «АНТ-25» таксама падрыхтаван.

Затым выказаўся тав. Леванеўскі, просячы дазволу на такі-ж палёт, але на 4-маторнай машыне. Наступнае слова было за мною. Я растлумачыў, што мой канчатковы выбар лёг на «АНТ-25», і мая думка выказана ў заявэ ўраду аб пералёце, якую мы падалі разам з Чкалавым. Я гаварыў аб тым, што «АНТ-25», не гледзячы на некаторую ўстараласць канструкцыі, упаўне можа ўстанавіць рэкорд дальнасці — самы цяжкі авіяцыйны рэкорд, што час вельмі спрыяе палёту, улічваючы велізарнэйшыя магчымасці дапамогі з боку палярнай экспедыцыі.

Калі мы нагаварыліся ўдосталь, таварыш Сталін звярнуўся да сваіх саратнікаў:

— Ну, што-ж, дазволім палёт?

Таварышы Молатаў, Варашылаў, Кагановіч і Ежоў адразу-ж падтрымалі Сталіна, і справа прынцыпова была прадвырашана. Таварыш Сталін, крыху падумаўшы, сказаў, што ўсё-ж трэба выклікаць тт. Алексніса і М. Кагановіча і, як непасрэдных кіраўнікоў авіяцыі, спытаць іх думку.

Чакаючы прыезду начальніка ваенна-паветраных сіл і кіраўніка авіяцыйнай прамысловасці, таварыш Сталін пачаў нас распытваць аб самалётах, якія мы выпрабавалі. Мне, у прыватнасці, давялося расказаць аб машыне канструктара Балхавітінава, на якой мы нядаўна ўстанавілі два міжнародных рэкорды. Затым гутарка перайшла на баявыя ўласцівасці нашых знішчальнікаў, і тут таварышы Сталін і Варашылаў праявілі сваю здольнасць адзначаць такія рашаючыя дробязі, аб якіх іншыя людзі часамі лічаць непатрэбным гаварыць. Клопаты аб моцнай і надзейнай абароне і аб добрай авіяцыі яшчэ доўга сквазілі ў пытаннях, заўвагах і расказах таварыша Сталіна.

Непрыкметна перайшлі на тэму аб якасцях амерыканскіх самалётаў. Таварыш Сталін падрабязна цікавіўся, што можна ўзяць у амерыканскай авіяцыі, чаму ў іх трэба павучыцца. Леванеўскі падрабязна расказаў аб амерыканскім самалётабудаўніцтве, аб закупленых ім там машынах.

У сяброўскай гутарцы мы параўноўвалі свае самалёты з амерыканскімі, знаходзячы ў апошніх добрую адзелку і павучальныя дробязі, якія нам трэба пераняць.

Гутарка цягнулася ўжо больш паўтары гадзіны. Таварыш Сталін зрэдку падыходзіў да каго-небудзь з наркомаў, рабіў розныя адзнакі ў паперах, затым, перагаварыўшы з тав. Молатавым, зноў стаў прахаджвацца па кабінеце, ведучы гутарку аб экспедыцыі на полюс.

Цёпла адзываючыся аб смелым калектыве палярнікаў, таварыш Сталін заўважыў, што цяпер, напэўна, нам будзе лягчэй ляцець праз Паўночны полюс.

— Таварыш Сталін, — смеючыся сказаў Чкалаў, — для нас гэта «горш»: Папанін-жа будзе даваць нам з полюса ўсё дрэннае, ды дрэннае надвор'е... так ніколі і не ўляціш...

— Вось табе і на! Мы думалі — будзе лепш, а вось аказваецца, што для лётчыкаў лепш-бы і не рабіць палёту на полюс, — жартаўліва сказаў таварыш Сталін, звяртаючыся да Молатава.

Тав. Молатаў, кінуўшы свае справы, паглядзеў на тав. Чкалава і, усміхнуўшыся, адлажыў папку. У гэты час увайшоў тав. М. Кагановіч, якога Сталін адразу-ж ва ўпор запытаў, як ён глядзіць на пералёт праз Паўночны полюс.

Міхаіл Кагановіч паглядзеў на нас і, памятаючы, як мы не раз яго асаджалі з сваімі планамі, адразу-ж сказаў сваю станоўчую думку.

Праз некалькі мінут быстра ўвайшоў тав. Алексніс, і тое-ж пытанне ва ўпор паследвала ад таварыша Сталіна.

— Як, можна ляцець праз Паўночны полюс у Амерыку?

— Ды па-мойму, у гэтым годзе ўмов ўпаўне спрыяючыя. Толькі на чым ляцець і хто павінен ляцець? — адказа Алексніс.

— Вось Чкалаў і Байдукоў зноў м чуць паляцець на «АНТ-25», — сказа таварыш Сталін.

— Падтрымліваю, — адказаў начал нік паветраных сіл.

— Ну што-ж, значыць, трэба запісаць наша рашэнне? — спытаў таварыш Сталін, звяртаючыся да ўсіх.

Тав. Молатаў стаў запісваць рашэнн ўрада аб пералёце праз Паўночны полю у Амерыку. Ужо першы пункт быў сфар мулёван і запісан, як таварыш Сталі прапанаваў яшчэ новы пункт а тым, каб абавязаць экіпаж у выпадку не спрыяючай абстаноўкі зрабіць пасадку любым пункце Канады, а ў выпадку па грозы экіпажу — зрабіць неадкладну пасадку.

Як усхвалявалі нас гэтыя мудрыя ста лінскія адносіны да людзей! Клопаты а чалавеку яшчэ раз ярка выразіліся н канкрэтным факце, які паказан унясен нем другога пункта ў рашэнне ўрада.

Ітак, рашэнне складзена. Мы прабыл сярод любімых кіраўнікоў партыі і ўрад тры гадзіны. Колькі каштоўнейшага час мы ў іх аднялі! Мы спяшым устаць Падзякаваўшы за ўвагу, проста і моцна развітваемся з таварышамі Сталіным. Молатавым, Варашылавым, Кагановічам і Ежовым і радасныя ад вялікага давер'я сваіх правадыроў і сваёй радзімы ўязджаем на аэрадром, дзе ў ангары стаіць вялікая чырвонакрылая птушка «АНТ-25».

Леташні Сталінскі маршрут прадоўжан яшчэ на некалькі тысяч кілометраў праз прасторы Арктыкі і Амерыкі з сэрца пролетарскай дзяржавы — Масквы ў ЗША.

**6 чэрвеня 1937 г.**
**Шчолкава.**

**(«ПРАВДА»).**

# XVI З'ЕЗД КП(б)Б

## СПРЭЧКІ ПА СПРАВАЗДАЧНАМУ ДАКЛАДУ САКРАТАРА ЦК КП(б)Б тав. В. Ф. ШАРАНГОВІЧА

### Выступленне т. Клімчука

(САКРАТАР МАГІЛЕЎСКАГА ГАРКОМА)

Большэвікі Беларусі сабраліся на свой XVI партыйны з'езд абмеркаваць работу Цэнтральнага Камітэта партыі за тры з лішнім гады і ўскрыць недахопы ў рабоце Цэнтральнага Камітэта партыі і ўсёй КП(б)Б, каб на падставе гістарычных рашэнняў Лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б), на падставе ўказанняў таварыша Сталіна ліквідаваць буйнейшыя недахопы ў нашай рабоце і яшчэ цясней згуртаваць рады КП(б)Б, яшчэ вышэй узняць рэвалюцыйную пільнасць, выкарчаваць, выпаліць дашчэнту ўсе гнёзды ворагаў народу, якім-бы сцягам яны ні прыкрываліся.

Таварышы, наша партыя за час пасля XVII з'езда дабілася перамог на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Совецкі Саюз ёсць непрыступная крэпасць сацыялізма, дастойная бацькаўшчына міжнароднага пролетарыята. Капіталісты за гэты час прабавалі не раз прашчупаць нашу сілу. Наша краіна давала самы рашучы адпор правакацыйным спробам, прымушала імперыялістаў лічыцца з нашай сілай і з тым, што нашы граніцы недатыкальны. Гэта рэзультат нашай непахіснай магутнасці, якая грунтуецца на беззаветнай адданасці ўсяго совецкага народу і ўсёй сацыялістычнай радзімы сваёй большэвіцкай партыі.

Тав. Шаранговіч у сваім дакладзе расказаў аб той велізарнейшай рабоце, праробленай Цэнтральным Камітэтам партыі за перыяд ад XV да XVI з'езда КП(б)Б і тых дасягненнях, якія мае наша Совецкая Беларусь і наша комуністычная партыя.

Таварышы, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта партыі, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна партыя разграміла подлых трацкістка-правых і права-ляванцкіх уродаў, ліквідавала капіталістычныя класы ўнутры краіны. Сацыялізм у нашай краіне перамог моцна і беспаваротна. Гэта мы маем у нашай Совецкай Беларусі, гэта мы маем і ў нашым Совецкім Саюзе.

Таварышы, кожны з нас адчувае гэта, бо ён з'яўляецца не толькі сведкай, але непасрэдным удзельнікам нашага сацыялістычнага будаўніцтва і ачысткі нашай партыі ад класава-чуждых элементаў і ворагаў народу.

Велізарнейшыя поспехі ў нашай краіне многім работнікам, як гаварыў таварыш Сталін, ускружылі галаву. Мы не бачылі за гэтымі поспехамі сваіх недахопаў у рабоце, захапіўшыся гаспадарчай работай замест правядзення глыбокай партыйнай работы. Гэта дала магчымасць ворагам рабіць свае подлыя справы.

Я хачу спыніцца некалькі на тым, як ухітраўся вораг працаваць у нас, у Беларусі, прабіраючыся на адказныя пасады, нават і ў Цэнтральны Камітэт партыі. Аб гэтым таварыш Шаранговіч у сваім дакладзе ўказаў, але я лічу таксама неабходным па гэтым пытанні спыніцца. Мы, члены пленума ЦК, нясем адказнасць за тое, што такія мярзотнікі як Ленцнер, Злотнік, Дзякаў, Бенек, Хадасевіч пападалі ў апарат ЦК, у склад пленума і Бюро. Мы нясем не меншую адказнасць, чым кіруючыя работнікі Цэнтральнага Камітэта.

Я лічу, што мы недастаткова крытыкавалі членаў ЦК, сакратароў райкомаў і гаркомаў, не дапамагалі Бюро ЦК партыі раскрыць ворагаў, і адказнасць за гэта кладзецца і на членаў і кандыдатаў ЦК. У гэтым мы дапусцілі грубейшую памылку.

Мне здаецца, што Галадзед на працягу ўсёй сваёй работы ў Соўнаркоме вёў няправільную, антыпартыйную лінію ў адносінах да Цэнтральнага Камітэта партыі; рашэнні Цэнтральнага Камітэта партыі ён свядома ігнараваў і не выконваў, Галадзед не жадаў працаваць з сапраўднымі большэвікамі, якія змагаюцца за лінію партыі. Галадзед не займаўся работай у Соўнаркоме, а займаўся палітыканствам, падборам сваіх людзей.

Аб рабоце аддзелаў ЦК. На гэтым пытанні нельга не спыніцца. Да пленума ЦК ВКП(б) мы з боку ЦК адчувалі па гаспадарчай лініі два аддзелы, якія зарушыліся, — гэта промаддзел і сельгасаддзел. Яны давалі тэлеграмы, яны патрабавалі зводак, яны тармашылі. Пасля Пленума ЦК ВКП(б) яны так перабудаваліся, што ні па гаспадарцы, ні па партыйнай лініі не адчуваюцца. Гэтыя аддзелы павінны заняцца зараз перабудовай работы з тым, каб не толькі займацца гаспадарчымі пытаннямі, але і партыйна-масавай і выхаваўчай работай.

Як працавалі інструктары ЦК? Тут таварышы скардзіліся, што ў іх не было інструктароў. Я ведаю, што да нас прыязджаў інструктар на адно прадпрыемства. Ён там пасядзеў два тыдні, абследаваў, праверыў, а потым забраў усе свае матэрыялы і паехаў у ЦК. Інструктары ЦК, калі прыязджаюць у раён, займаюцца тым, што нанізваюць факты, звяртаюцца з імі ў ЦК, перадаюць гэтыя факты загадчыку аддзелам, а той піша сакратару ЦК, што вось, моў, выкрылі такія-та агідныя і т. д. У нас быў такі факт: прыехаў да нас т. Чорны на аўтамабілі, пасядзеў некалькі дзён і паехаў назад. Мы толькі тады пазнаёміліся ў райкоме з матэрыяламі абследвання, калі тав. Валковіч пераслаў іх нам.

Значыцца, трэба перабудаваць і інструктарам аддзелаў ЦК, трэба ім дапамагчы ў правядзенні партыйна-масавай работы. Трэба, каб аддзелы ЦК дапамагалі ў рабоце нашым інструктарам райкомаў і гаркомаў. Інструктары аддзелаў ЦК не былі ў дастатковай меры звязаны з сельскімі раённымі інструктарамі, таму мы мелі такую слабую работу на мясцах.

Некалькі слоў аб аддзеле партыйнай прапаганды і агітацыі. Тав. Готфрыд, безумоўна, жвавы чалавек. Ён дапамагаў нам многа, будучы загадчыкам промаддзела. Але як толькі ён перайшоў у аддзел партпрапаганды і агітацыі, то тут ён вязе не больш, чым вёз Конік і таксама мітусіцца, а справа не рухаецца.

Таз. Готфрыд па аддзелу агітацыі і прапаганды і т. Казюк па аддзелу друку працуюць амаль аднолькава дрэнна, не гаворачы ўжо аб аддзеле школ, які наогул нічога не робіць.

### Выступленне тав. Пяркоўскага

(РЭДАКТАР ЛЕПЕЛЬСКАЙ АКРУГОВАЙ ГАЗЕТЫ)

Роля нашага большэвіцкага друку ў справе ажыццяўлення рашэнняў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна выключна велізарна і адказна.

Аднак партыйнае кіраўніцтва газетамі да апошняга часу астаецца не на належнай вышыні. Аб гэтым сведчаць факты выяўленай засмечанасці рэдакцый нашых газет—цэнтральных, раённых і акруговых класава варожымі, трацкісцкімі, нацдэмаўскімі элементамі.

Усім вядома, што ў рэдакцыі «Звязды» —ЦО нашай партыі—падвізаўся трапкіст Ленцнер; ён узначальваў газету. Там арудавалі вядомыя ворагі як трацкіст-тэрарыст Розенблюм і інш.

Мы ведаем, што на чале рэдакцыі газеты «Рабочий» доўгі час быў трапкіст Хейфец; там працавалі трацкісты Гінзбург і інш.

І ў іншых газетах, напрыклад, «Чырвоная змена» і інш., звілі сабе гнязло класавыя ворагі. Рэдактарам барысаўскай газеты быў вядомы трацкіст — правакатар Спефановіч.

Класавы вораг скарыстоўваў палітычную блізарукасць асобных партыйных кіраўнікоў, асобных райкомаў для таго, каб скарыстаць гэтую магутную зброю нашай партыі—друк—у сваіх варожых інтарэсах.

На чале аддзела друку стаяў трацкіст Мінкін. Гэтаму Мінкіну быў перададзеран падбор кадраў. Мінкін распараджаўся газетнымі кадрамі, і зразумела, чаму мы маем засмечанасць апаратаў рэдакцый газет.

А якое становішча мы маем зараз на мясцах з людзьмі, пранікнутымі ў газетах? У нас кіруюць газетай малападрыхтаваныя людзі.

Цэлы рад газет марнее. Вазьміце вы чырвонапольскую раённую газету. Колькі аб ёй не гаварылі, колькі аб ёй не пісалі, — газета, якую трэба было даўно ўмацаваць, усё яшчэ мае надзвычай нізкі палітычны ўзровень. Або ушанская раённая газета. Яна шэрая, непікавая, яе не хочуць чытаць. Такое-ж становішча маем і ў Церахоўскім, і ў Дубровенскім і ў іншых раёнах.

Матэрыяльная база раённых газет выключна слабая; яе трэба будзе моцна і моцна ўмацаваць.

Акруговыя газеты БССР знаходзяцца ў куды горшым становішчы, чым акруговыя газеты суседніх з намі абласцей і рэспублік.

Акруговыя газеты яшчэ не сталі магутным сродкам у справе выхавання мас, у справе ўмацавання нашых пагранічных раёнаў.

Некалькі слоў аб рабоце аддзела друку ЦК партыі. Я згодзен з тав. Мінкіным з завода «Большэвік», што аддзел друку ЦК на мясцах не адчуваецца. Калі не адчуваецца ён тут, у Менску, то што ўжо газарыць пра акругі і раёны. Тав. Казюк, які ўзначальвае гэты аддзел, яшчэ да апошняга часу не перабудаваў сваю работу. Інструктары гэтага аддзела ўсю работу праводзяць унутры аддзела, вельмі дрэнна звязаны з масамі. Я другі год працую ў Лепелі рэдактарам акруговай газеты. За гэты час нікога з работнікаў аддзела друку я ў сябе не бачыў. Каб ім прыехаць у акругу, раён, дапамагчы рэдактару распрацаваць цэлы рад мерапрыемстваў, дык дзе там, аддзел друку не практыкуе гэтага. Трэба прама сказаць, што і бюро ЦК, сакратары ЦК тт. Гікало і Валкозіч, пытанню друку не надавалі належнай увагі. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што газетныя кадры ў БССР разбазараны, пасланы на іншыя ўчасткі работы.

Адносна рэдакцыі газеты «Звязда». Мы павінны ў першую чаргу вучыцца ў нашай ленінска-сталінскай «Праўды». І мы ў яе вучымся. Але «Звязда» — орган ЦК — павінна вучыць нас, як трэба прапаваць. Ці можам мы ў яе вучыцца? Не! Газета «Звязда» часта нічым не адрозніваецца ад акруговай і раённай газеты.

Таварышы! Многатысячныя насценныя газеты і на мясцах, і тут, у цэнтры, недаацэньваюцца. Трэба будзе над гэтым пытаннем моцна прызадумацца. Я асабіста думаю, што ЦК павінен задумацца над пытаннем склікання ў бліжэйшым часе ўсебеларускага з'езда рэдактароў газет і рабселькораў, на якім паставіць рад пытанняў аб перабудове работы.

Няма сумнення ў тым, што большэвіцкі друк нашай рэспублікі, пад кіраўніцтвам ЦК, пад кіраўніцтвам нашых партыйных арганізацый на мясцах, поўнасцю справіцца з тымі задачамі, якія пастаўлены перад ім у справе перабудовы работы, у справе выканання тых задач, якія высунуты новай Сталінскай Канстытуцыяй.

Мы будзем метка разіць ворага, пад якою-б маскаю ён ні хаваўся. Будзем згуртоўваць масы вакол ЦК, вакол таварыша **Сталіна** для новых перамог ў барацьбе за сацыялізм.

Група дэлегатаў XVI з'езда КП(б)Б ад Слуцкай партарганізацыі. Фото Я. Салавейчыка.

### Выступленне тав. Шусціна

(УПАЎНАВАЖАНЫ КПК ПА БССР)

Таварышы, наша партыя Леніна — Сталіна дасягнула велізарнейшых поспехаў. 20-годдзе існавання совецкай улады з'яўляецца тэрмінам невялікім для гісторыі, але поспехі, якіх мы дасягнулі за гэты перыяд, каласальныя. Мы пабудавалі новую краіну, краіну сацыялізма. Мы ажыццявілі першую фазу комуністычнага грамадства. Беларуская Совецкая рэспубліка мае бясспрэчныя поспехі. Змяніўся твар рэспублікі. Беларусь, як і ўся наша сацыялістычная краіна, пад кіраўніцтвам партыі ідзе ўсё далей і далей да новых перамог.

Аднак, тыя поспехі, якія мы маем у Беларусі, ніякага права не даюць нам замаўчваць ценявыя бакі, якія мы маем. Таварыш Сталін на Пленуме ЦК ВКП(б) у сваім дакладзе гаварыў аб небяспецы, якая ёсць у сувязі з нашымі поспехамі, што поспехі ствараюць зазнайства, самахвальства і яны вядуць многіх не туды, куды трэба. І ў Беларусі вельмі многа гаварылі аб поспехах. Гэта вельмі затуманіла многім галовы.

Страта большэвіцкай пільнасці і настарожанасці стварыла спрыяючую глебу для шкодніцкай работы ворагам народу, якія прабраліся на вельмі адказныя ўчасткі.

Я хачу даць характарыстыку некаторым з іх. Возьмем Бенека. Ён, стары работнік Беларусі, працаваў тут даўно і вельмі многія яго ведаюць. Між тым, амаль да апошняга часу партыйная арганізацыя не ведала, што на Бенека мелася велізарная колькасць матэрыялу, выкрываючага яго не толькі як трацкіста ў 1927 годзе, але як шпіёна, дыверсанта. Яшчэ ў 1921 годзе быў матэрыял, што ён з'яўляецца шпіёнам. Гэта быў адзін матэрыял. Былі яшчэ матэрыялы, што ў 1923—27 гг. Бенек выступаў як трацкіст. У 1936 годзе былі сігналы аб тым, што Бенек з'яўляецца шпіёнам.

Аб Бенеку пытанне ставілася не раз. Я нават памятаю сваё выступленне, калі стаяла пытанне аб аднаасобніках і я тады гаварыў на бюро, што аб шкодніцкай рабоце, якая праводзіцца ў адносінах аднаасобнікаў, не можа не ведаць Бенек, як нарком земляробства. Але Бенек карыстаўся такім аўтарытэтам у бюро, што астаўся нявыкрытым.

Вось 1 студзеня 1937 года мы даем запіску ў ЦК партыі: становішча конскага паголоўя ў Беларусі катастрафічнае, з 1934 года па 1937 год мы страцілі многа коней. І вось Бенек, гэты вораг, выступае і заяўляе, што прыведзеная намі лічба няправільная. І гэтага было дастаткова, каб Наркамзем і Бенек вышлі чыстымі, а ўсю віну ўсклалі на райвыканкомы.

Другое пытанне, якое мы паставілі, — гэта пытанне аб севазваротах. Мы паказалі, што Наркамзем БССР у гэтай галіне вядзе шкодніцкую работу, што зараз ва многіх калгасах БССР існуе не толькі старая трохпольная сістэма, але ў некаторых калгасах — двухпольная сістэма. Але гэта прайшло міма ЦК.

Для таго, каб азлобіць калгаснае сялянства супроць партыі, ворагі праводзілі такую палітыку: парушалі сельскагаспадарчы статут і не давалі амаль ніякай прысядзібнай зямлі калгаснікам. Але Бенек лічыўся спецыялістам па пытаннях сельскай гаспадаркі. Яму давяралі, і людзі, якія сядзелі ў ЦК, не дадумаліся глыбока да гэтага пытання.

Калі мы возьмем па лініі Наркомасветы, дык мы маем рад шкодніцкіх актаў. У прыватнасці, возьмем пытанне аб выкладанні рускай мовы. Дастаткова сказаць, што колькасць гадзін на нямецкую мову была адведзена большая, чым на рускую. Мы аб гэтым паставілі ў бюро Камісіі Партыйнага Кантроля, і бюро мела спецыяльнае рашэнне па гэтаму пытанню.

Апрача гэтага былі класава-чуждыя элементы ў Наркомасветы, якіх мы выключылі з партыі. Мы мелі таксама сваю асобную думку аб Дзякаве. Рад пытанняў мы паставілі ў ЦК.

Некалькі слоў аб совецкай рабоце. Мы зараз чулі інфармацыю аб Галадзедзе, яго нахабнасці, якая пераходзіла ўсякія межы. Нядаўна Галадзед падаў заяву, у якой абвінавачвае тав. Рубінштэйна ў тым, што Рубінштэйн няправільна выказваўся на Менскай канферэнцыі адносна яго. Прычым Галадзед настолькі нахабна вёў сябе, што адмаўляў якую-небудзь віну ў адносінах сябе.

Мне ўспамінаецца рад такіх фактаў адносна Галадзеда. Напрыклад, калі разбіралася пытанне адносна Дубіны, то была ўнесена прапанова, што пытанне ідзе аб антыпартыйных паводзінах Дубіны. Галадзед выступіў супроць гэтай фармулёўкі ў абарону Дубіны. У Галадзеда меўся рад такіх фактаў, калі ён не цярпеў крытыкі; ён лічыў, што адзіная ўлада, адзіны кіруючы работнік у Беларусі — гэта ён. І вось вы зараз бачыце, што Галадзед вельмі многа перашкаджаў у рабоце ЦК партыі. Галадзед сваімі антыпартыйнымі, шкодніцкімі дзеяннямі не даваў магчымасці працаваць партыйнай арганізацыі Беларусі.

Некалькі слоў адносна Чарвякова. Тыя факты, якія прыводзіў тут тав. Рубінштэйн, дастаткова характарызуюць ролю Чарвякова ў Беларусі.

ЦВК БССР працуе вельмі дрэнна. Вось некаторыя даныя. Нядаўнім абследваннем Камісіі Партыйнага Кантроля выяўлена, што ўсе пасяджэнні прэзідыума ЦВК з'яўляюцца фактычна незаконнымі таму, што яны праводзіліся 1—2 асобамі. Арганізацыйная работа ЦВК адсутнічае.

Таварышы, я думаю, што ўсе гэтыя пытанні, якія ставіліся тут на з'ездзе, апэнка, якая дана ў выступленнях адносна работы ЦК КП(б)Б, павінны легчы ў аснову пастановы, якая будзе прынята з'ездам партыі.

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), пад кіраўніцтвам нашага дарагога настаўніка, друга таварыша Сталіна мы пойдзем да ўсё новых і новых перамог.

### Выступленне тав. Жыткова

(САКРАТАР СЛУЦКАГА РАЙКОМА)

Абмяркоўваючы справаздачны даклад т. Шаранговіча і ўдумваючыся ва ўсё, што адбываецца за апошні час у нас у КП(б)Б, яшчэ і яшчэ раз прыходзіцца пераконвацца, наколькі вялікае значэнне ў нашай практычнай рабоце маюць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), наколькі велізарна гістарычнае і палітычнае значэнне даклада і заключнага слова таварыша Сталіна на гэтым Пленуме для нас, практычных работнікаў.

Як магло здарыцца, што ў нас у КП(б)Б ворагі знаходзіліся так доўга на вельмі адказных пастах і так доўга не былі выкрыты? Мне здаецца, што гэта магло здарыцца толькі таму, што ў нас у практычнай рабоце была ў паяўнасці ідыёцкая хвароба, палітычная блізарукасць, таму, што ў нас у штодзённай рабоце не было сталай выхаваўчай работы з комуністамі, не было развароту крытыкі, так як вучыць таварыш Сталін. Іменна таму мы не заўсёды рэагавалі на шкодніцкія ўстаноўкі, якія даваліся ворагам народу Бенекам у сельскай гаспадарцы. Узяць хаця-б Слуцкі раён; там перагібаў зроблена вельмі многа. Вялікая колькасць аднаасобнікаў пакінута зусім без зямлі, вялікая колькасць аднаасобнікаў пазбаўлена сядзібных участкаў. Гэта рабілася па прамой дырэктыве ворага народу, каб азлобіць аднаасобніка супроць совецкай улады.

Яшчэ адно пытанне. У нашым раёне пяць чалавек згубілі партбілеты. Гэта, зразумела, вельмі дрэнна. Мы разглядалі гэта пытанне на райкоме. Некаторых мы выключылі з партыі, аб некаторых узбудзілі хадайніцтва, каб выдаць ім новыя білеты. Не гледзячы на тое, што ўжо 6 месяцаў прайшло, мы запрашвалі ЦК 2—3 разы, але да сёнешняга дня мы нз ведаем ці правільна наша рашэнне. Калі яно няправільна, трэба адмяніць, выключыць гэтых людзей з партыі, калі яно правільнае, трэба пацвердзіць, выдаць партбілеты гэтым асобам. Да сёнешняга дня гэта пытанне не вырашана.

Разважанняў аб перабудове партыйнай работы ў нас, безумоўна, многа, а з перабудовай справа абстаіць пакуль што дрэнна. І не таму, што партыйныя арганізацыі не хочуць перабудоўвацца. Жаданні, безумоўна, ёсць, але многія не ведаюць як-жа гэтую перабудову пачаць. І тут, мне здаецца, АКПО, наш партыйны друк павінны выступіць у якасці памочнікаў, у якасці арганізатараў перабудовы партыйнай работы.

Я павінен сказаць, таварышы, што наш друк, гэта можна гаварыць і аб раённым і аб акруговым і рэспубліканскім друку, вельмі малую актыўнасць праяўляе, каб арганізаваць абмен вопытам у перабудове партыйнай работы. А ў гэтым ёсць прамая неабходнасць, вострая неабходнасць і вялікая патрэба. Мы павінны будзем патрабаваць і ад нашых рэспубліканскіх газет, а на падставе рэспубліканскіх газэт будуць перабудоўвацца раённыя і акруговыя газеты, і ад АКПО, каб яны гэту справу ўзначалілі, арганізавалі абмен вопытам партыйнай работы для таго, каб дапамагчы партыйным арганізацыям.

Наша партыйная работа павінна быць пастаўлена так, каб усе гаспадарча-палітычныя задачы, якія ставяць перад намі ЦК нашай партыі і ўрад, выконваць у тэрмін. Трэба, каб наша партыйная работа выхоўвала-б вядучую ролю ў комуніста на любым участку, дзе-б ён ні знаходзіўся. Трэба, каб наша партыйная работа была пастаўлена так, каб павышалася пільнасць комуністаў, каб ідэйна-палітычны ўзровень партарганізацыі стаяў-бы на высаце тых патрабаванняў і задач, якія высоўвае перад намі партыя.

### Выступленне тав. Юркова

(АДКАЗНЫ РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»)

Таварышы, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і вялікага **Сталіна** атрыманы велізарныя і неаспрэчныя перамогі сацыялізма.

Наша краіна ідзе да комунізма. Воля і жаданне мільёнаў — гэта ісці быстрэй па шляху комунізма. Наша партыя стаіць на чале гэтага руху, знішчаючы перашкоды, прарэхі і недахопы.

Пражэктарам, асвятляючым нашы промахі і шляхі іх ліквідацыі, з'яўляецца большэвіцкая крытыка і самакрытыка. Небывала ўзняўшыйся ўзровень самакрытыкі — адзнака растучай сілы краіны, яе партыі, актыўнасці яе членаў.

Адзнакай нашай растучай сілы і паспяховай ліквідацыі бясклопатнасці з'яўляецца таксама ўскрыццё ворагаў народу, трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх шкоднікаў, шпіёнаў і тэрарыстаў.

Востра і рэзка і зусім правільна дэлегаты з'езда крытыкавалі становішча нашага друку і асабліва моцна крытыкавалі работу ЦО КП(б)Б—«Звязду». І гэта не выпадкова. У рабоце друку ёсць сур'ёзнейшыя промахі.

Недахопы ў рабоце, аб якіх гаварыў таварыш Сталін у сваім дакладзе і заключным слове, палкам і поўнасцю адносяцца да друку, і, у прыватнасці, да друку БССР.

Больш таго, у нас гэтыя промахі, недахопы ў рабоце і бясклопатнасць праявіліся мацней. Дазвольце мне паказаць гэта на некалькіх прыкладах.

Нельга сказаць, каб наш друк не гаварыў аб капіталістычным акружэнні. У прыватнасці, і «Звязда» гаварыла аб капіталістычным акружэнні і аб пагранічным становішчы рэспублікі. Практычныя-ж вывады з гэтага факта не рабілі і атрымалася сапраўды балбатня.

Больш таго, з таго факта, што мы знаходзімся вельмі блізка ад граніцы, мы часта рабілі няправільныя вывады. Мы лічылі, што пісаць аб недахопах — значыць даваць ворагу зброю ў рукі, узброіць яго супроць нас. Гэтым самым крытыку не развівалі, не заўважылі дзеянні ворага, прытупілі рэволюцыйную пільнасць, а ворагі ў свой час дзейнічалі.

На імя рэдакцыі мы атрымліваем сотні пісем. Сярод іх ёсць і пісьмы ворагаў. Вораг выказвае вельмі вялікую надзею на вайну, на капіталістычнае акружэнне. У яго прамы рахунак на вайну. Адзін паркоўнік прыслаў пісьмо, з якога відаць, што ён таксама разлічвае на падтрымку з заграніцы. Такім чынам, вораг яўна разлічвае на падтрымку капіталістычнага акружэння.

Мы мелі шмат сігналаў аб парушэнні палатковай палітыкі, аб парушэнні асноўных прынцыпаў палітыкі совецкай улады ў радзе раёнаў (лепельская справа). Былі сігналы і аб парушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі. Калі-б мы ўважлівей прыслухоўваліся да сігналаў, калі-б мы абагулілі, зрабілі вывад з гэтых сігналаў, калі-б мы не баяліся ўголас гаварыць аб нашых недахопах, то вораг Бенек быў-бы даўным даўно ўскрыт. Дастаткова было прыглядзецца да апарата Наркамзема, дзе цэлая пачка людзей— перабежчыкі з Польшчы, каб устанавіць, што там не ўсё добра.

Апарат Наркамзема тым больш павінен быў-бы выклікаць сумненне таму, што з раёнаў ішлі сігналы аб шкодніцкай рабоце і ў жывёлагадоўлі, і ў галіне севазвароту, і ў галіне землеўпарадкавання і т. д.

На працягу-ж цэлага раду год Наркамзем вёў работу па землеўпарадкаванню, а землеўпарадкаван усяго толькі адзін раён. Павінен-жа быў прыцягнуць увагу такі факт. Пасля праведзеных 70—80 проц. работ па землеўпарадкаванню Наркамзем знімае землеўпарадкоўчую партыю. Уся работа такім чынам прападае, сродкі выдаткаваны дарэмна. Усе гэтыя факты прымушалі прызадумацца. Аднак, Наркамзем пачалі займацца вельмі позна.

Было дастаткова таксама сігналаў для таго, каб сур'ёзна прыглядзецца к рабоце Соўнаркома і Галадзеда. Сігналаў было многа. Скардзіліся на тое, што затрымліваліся важнейшыя справы, што вострыя пытанні не вырашаліся, быў цэлы рад сігналаў аб правадырызме Галадзеда. К гэтым сігналам не адносіліся па-сапраўднаму па-большэвіцку, праяўляючы іншы раз трусасць.

Галадзед зараз выкрыт. Але ці выкрыта да канца антыпартыйная, дзейнасць той групы, якую ўзначальваў Галадзед? Зараз вядома, што ў гэтай групе былі махровыя ярыя фашысты Убарэвіч і Дубіна. Але мне здаецца, таварышы, што гэту антыпартыйную групу Галадзеда, людзей, з якімі ён праводзіў сваю лінію, у прыватнасці, сваю барацьбу супроць Цэнтральнага Камітэта партыі, мы яшчэ ў дастатковай меры не выкрылі.

І роля друку ў разгроме і выкарчоўванні групаўшчыны, у выкрыцці ворагаў народу, у разгроме ўсёй зграі шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў вельмі вялікая.

Трэба пакончыць з такой практыкай, калі замест прыслухоўвання да сігналаў, замест большэвіцкага на іх рэагавання вельмі часта друк публікуе моташныя рапарты і падхалімскія прывітанні. Я сам папаў у гэты фарватэр і пайшоў настолькі далёка, што, узвышаючы тав. Гікало, які не адчуваў у гэтым патрэбы, зрабіў паклёп на яўрэйскі і беларускі народ. Гэта мая памылка. Аб гэтай памылцы я гаварыў на раённых партыйных канферэнцыях, дзе я быў; аб гэтай буйнай палітычнай памылцы я лічу неабходным сказаць і тут на з'ездзе КП(б)Б.

У апараце «Звязды» доўгі час сядзелі ворагі народу. Лінію ігнаравання на сігналы пісем працоўных яны праводзілі на працягу доўгага часу. Зараз мы перабудоўваем работу аддзела пісем, які да апошняга часу быў закінутым участкам у рэдакцыі. Запушчанасць у гэтай справе так велика, што нам трэба многа папрацаваць, каб склаўшыяся барска-бюракратычныя традыцыі рашуча разбіць.

Я павінен прама сказаць, што з боку цэлага раду партыйных арганізацый няма правільных адносін да пісем працоўных. «Звяздой» было паслана ў Талочын 133 пісьмы, на якія не атрыман ні адзін адказ, у Оршу было паслана 119. Мазыр — 127, Парычы — 107 і т. д. Да гэтага часу людзі не палічылі патрэбным расследваць пісьмы. Я назваў тут толькі тыя раёны, куды паслана больш ста пісем працоўных. Але і ў іншых раёнах з пісьмамі працуюць дрэнна.

Некаторыя раёны і наркаматы замест расследвання фактаў займаюцца адпіскай.

Тав. Юркоў паведамляе з'езду факты бюракратычных адносін да пісем працоўных, якія мелі месца ў Наркамземе і Наркамаце аховы здароўя БССР, а таксама ў радзе райвыканкомаў.

«Звязду» трэба рашуча крытыкаваць. Недахопаў у нас многа, крытыка ласць магчымасць выправіць памылкі. Але мы патрабуем сур'ёзна адносіцца да сігналаў друку і дапамагчы нам у тым, каб сапраўды ператварыць «Звязду» ў баявы орган нашай КП(б)Б.

*ПЕРАВЫБАРЫ ПРОФАРГАНІЗАЦЫЙ*

# СУПРОЦЬ ВОЛІ ЧЛЕНАЎ САЮЗА

Тонкія сцены і столь аддзелачнага цэха не могуць заглушыць безупынны гул лентачных машын. Але гэта не перашкаджала фабкому фабрыкі імя Кагановіча іменна тут у аддзелачным цэху праводзіць справаздачна-выбарчыя профсаюзныя сходы рабочых цясальнага і іншых дапаможных цэхаў.

Час таксама не быў улічан. Прама з работы на сход. Фабком менш за ўсё цікавіцца стварэннем патрэбнай абстаноўкі для дзелавога правядзення сходу.

Як і трэба было чакаць, сход праходзіў незвычайна. Спрэчкі па справаздачнаму дакладу, калі не лічыць выступленні —3 таварышоў, не насілі востры крытычны характар. Работа фабкома ўсебакова не была абмеркавана, не была прааналізавана сапраўднай большэвіцкай крытыкай. К канцу першага сходу (сход праходзіў два дні) з 132 з'явіўшыхся асталося ўсяго 78.

А сход можна было правесці на высокім узроўні. Варта было толькі даць работнікам некалькі гадзін адпачыць і праводзіць сход не ў цэху, дзе чуцен безупынны гул машын, а ў клубе, які знаходзіцца тут-жа недалёка ад фабрыкі.

Як ні дзіўна, але з парадку дня сходу выпала такое пытанне, як справаздача рэвізійнай камісіі фабкома. Удзельнікі сходу вельмі здзівіліся і былі абураны прапановай старшыні фабкома тав. Кароткай аб знятці з парадку дня даклада рэвізійнай камісіі. Яны не згадзіліся з такой прапанозай. Члены саюза законна патрабавалі і рашылі справаздачны даклад рэвізійнай камісіі ўключыць у парадак дня. Але даклада не было. Кароткая змагла дамагчыся свайго і «ўбрць» з парадку дня такое важнае пытанне, як справаздача рэвізійнай камісіі.

ЦК саюза ільняшчыкаў знаходзіцца ў самым Віцебску, але ні старшыня ЦК Кавалеўскі і ніхто з іншых работнікаў ЦК саюза на сход не палічылі патрэбным з'явіцца. Рабочыя гэта правільна расцэньваюць, як нацыянальскія адносіны профбюракратаў з ЦК саюза да самай буйнай профарганізацыі, якой з'яўляецца калектыў фабрыкі імя Кагановіча.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

# ПАРУШЭННІ ІНСТРУКЦЫЙ АБ ВЫБАРАХ

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). У Мазыры пачаліся справаздачы і выбары профсаюзных органаў. Першыя справаздачна-выбарчыя сходы паказваюць, што профсаюзныя арганізацыі горада не правялі патрэбнай падрыхтоўкі, не растлумачылі членам саюза пастановы пленума ВЦСПС. У выніку — справаздачна-выбарчыя сходы праходзяць на нізкім палітычным узроўні і ў многіх выпадках парушаюцца ўказанні пленума ВЦСПС аб парадку выбараў.

Групком саюза пырульнікаў, напрыклад, пачаў раней выбары прафоргаў і цэхкомаў, у той час як, згодна ўказанняў пленума ВЦСПС, трэба было спачатку правесці выбары групкома. Характэрна, што выбарамі «кіраваў» сам старшыня оргбюро ЦК саюза пырульнікаў і лазнепральных работнікаў т. Брук.

Групком саюза будаўнікоў таксама парушыў пастанову пленума ВЦСПС. Ён рашыў справаздачы цэхкомаў і прафоргаў праводзіць да выбараў групкома, а выбары цэхкомаў і прафоргаў правесці пасля выбараў групкома. Першы справаздачны сход членаў саюза, занятых на будаўніцтве электрастанцыі, праведзен быў пры наяўнасці на сходзе 25 проц. членаў саюза, якія знаходзяцца на ўчоце ў цэхкоме. У выніку — работа цэхкома не была падвергнута крытыцы. На гэтым сходзе прысутнічаў інструктар ЦК саюза будаўнікоў т. Эстрына, якая не растлумачыла членам профсаюза, што такі сход з'яўляецца непаравамоцным.

Непаразамоцны профсаюзны сход праведзен быў і на лесазаводзе Пхоў. Там прысутнічала на сходзе ўсяго 27 проц. членаў саюза.

Усё гэта гаворыць аб тым, што партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў і ўстаноў, ды і сам райком партыі, стаяць у баку ад выбараў профарганізацый.

# НЕПРАВАМОЦНЫ СХОД

Неарганізавана прайшоў справаздачна-выбарчы сход на менскай швейнай фабрыцы імя Крупскай. Сход пачаўся са спазненнем на 1 гадзіну 40 мінут. Старшыня фабкома тав. Карасік адкрыў сход, не паведаміўшы колькі з'явілася членаў профсаюза. Між тым, к моманту адкрыцця сходу прышло толькі 425 чал. замест 794. Зусім відавочна, што сход не быў правамоцным. Але тав. Карасік, папіраючы профсаюзную дэмакратыю, абвясціў сход адкрытым.

Справаздачны даклад т. Карасіка аб рабоце фабкома быў не самакрытычны і не канкрэтны. Дакладчык газарыў агульна, не ўскрыў карэнняў прарыву ў профсаюзнай рабоце.

Спрэчкі па справаздачы фабкома прайшлі на нізкім палітычным узроўні. Гэта разультат таго, што фабком не прадпрыняў патрэбнай падрыхтоўчай работы, не давёў да членаў профсаюза рашэнні пленума ВЦСПС.

Усяго выказалася 14 чалавек. Рад выступаўшых на канкрэтных прыкладах паказалі аларванасць фабкома ад масы членаў профсаюза. Фабком не цікавіўся жыццём рабочых. Ён не клапаціўся аб налажанні палітычна-масавай работы. На фабрыцы 1017 працуючых, а членствам у профсаюз ахоплена толькі 880. Ніякай работы з актывам не праводзілася. Работніца т. Пюшкевіч у сваім выступленні гаворыць:

— У нас на фабрыцы ёсць значны актыў але фабком ім не кіраваў, ён ні разу не сабраў яго, не пагаварыў нават аб іх патрабаваннях.

Фабком зусім не займаўся пытаннямі аховы працы і тэхнікай безапаснасці. Неатнаразовыя сігналы рабочых і служачых аб парушэнні правіл тэхнікі безапаснасці асталіся без увагі.

У першым трэцім, навалачным і закройным цэхах няма вентыляцыі. У трэцім цэху няма агарожы да трансмісіі. Між тым, адпушчаныя сродкі на ахову працы ў суме 7.000 руб. скарыстаны не па прызначэнню.

Пасля намячэння кандыдатур у новы склад фабкома аб'яўлены сход закончыў работу. Абмеркаванне і тайнае галасаванне будзе праходзіць па цэхах.

АСТРОЎСКІ.

# НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

## ЭВАКУАЦЫЯ БІЛЬБАО

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 20 чэрвеня. К усходу ад Більбао (сталіцы краіны Баскаў) мяцежнікі і інтэрвенты ўчора ўвялі ў бой дзве італьянскія дывізіі і вялікую колькасць танкаў. Абаронцы Більбао праявілі выключную мужнасць і гераізм. Яны абаранялі літаральна кожную пядзю зямлі. Танкавай атакай мяцежнікаў і інтэрвентаў удалося дасягнуць левага берага ракі Нервьон і заняць частку Старога Більбао, размешчанага на правым беразе гэтай ракі. Пасля гэтага асноўныя сілы рэспубліканскіх войск пачалі адыход на захад ад Більбао. У горадзе асталіся асобныя часці, якія прыкрывалі эвакуацыю людзей і маёмасці.

Агенцтва Сентраль-ньюс у паведамленні з Мадрыда перадае, што там апублікавана афіцыяльнае паведамленне, у якім гаворыцца аб эвакуацыі Більбао. У паведамленні ўказваецца, што пасля атакі пераважных сіл мяцежнікаў і інтэрвентаў, падтрыманых германскімі і італьянскімі самалётамі і танкамі, часці баскскай арміі ў Більбао аказаліся не ў стане прадаўжаць супраціўленне, і ў 16 гадзін 19 чэрвеня эвакуявалі горад. У паведамленні падкрэсліваецца, што абарона іншых баскскіх гарадоў будзе яшчэ больш жорсткай і што падзенне Більбао не азначае спынення барацьбы баскскага народу за сваю свабоду і незалежнасць.

Германскія і італьянскія бамбардыроўшчыкі вялуць бесперапынную бамбардыроўку пазіцый рэспубліканцаў, дарогі з Більбао ў Сантандэр і ваколіц Більбао, па якіх рухаюцца бежанцы. Налічваюць не менш ста італьянскіх і германскіх самалётаў, прымаючых удзел у бамбардыроўцы.

Згодна апошніх вестак, атрыманых агенцтвам Гавас 21 чэрвеня з Більбао асноўная частка баскскіх войск адышла на захад ад Більбао ў раён руднікоў, размешчаных паміж гарамі Сан Хуліян, Мускетс і Эрэса.

Каля доменных пячэй у Баракальдо (на паўночны ўсход ад Більбао) некалькі груп рэспубліканцаў аказваюць яраснае супраціўленне мяцежнікам, якія, заняўшы горад, нібыта прадаўжаюць наступленне. Барацьба, як думаюць, будзе працягвацца ў раёне руднікоў.

## Пахаванне афяр узрыву на „Хаіме-I"

ВАЛЕНСІЯ, 20 чэрвеня. (БЕЛТА). У Картахене (порт на поўдні Іспаніі) адбылося пахаванне афяр узрыву на рэспубліканскім лінкоры «Хаіме-I». У пахаванні прынялі ўдзел велізарныя масы народу, а таксама прадстаўнікі ўрада, палітычных партый, профсаюзных арганізацый, арміі, флота і авіяцыі.

—o—

## Падпісанне пагадзення паміж СССР і Латвіяй

21 чэрвеня ў Наркамаце замежных спраў адбылося падпісанне пратакола паміж Саюзам Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Латвійскай рэспублікай аб змене артыкулаў 2-га і 4-га гаспадарчага пагадзення і пункта 3-га заключнага пратакола да яго, падпісаных Саюзам ССР і Латвіяй 4-га снежня 1933 г.

З боку Саюза ССР азначаны пратакол падпісаў намеснік народнага камісара замежных спраў тав. В. П. Папёмкін, а з боку Латвійскай рэспублікі — міністр замежных спраў п. Мунтэрс, які знаходзіцца ў Маскве.

# АДСТАЎКА ФРАНЦУЗСКАГА УРАДА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння ноччу ў 2 гадзіны 25 мінут урад Блюма падаў у адстаўку. Прэзідэнт Лебрэн прыняў адстаўку.

Перад адстаўкаю адбылося пасяджэнне сената (верхняй палаты), адхіліўшага большасцю 168 галасоў супроць 96 кампрамісны тэкст законапраекта аб надзвычайных паўнамоцтвах урада, які прапанавала дэлегацыя левых груп палаты дэпутатаў. Сенат зноў прыняў тэкст, выпрацаваны фінансавай камісіяй сената. Пасля пасяджэння сената прэм'ер Блюм гутарыў з комуністычнымі дэпутатамі Дзюкло і Жытонам.

У 12 гадзін ночы пачалося пасяджэнне ўрада пад старшынствам Блюма. Адначасова праходзіла нарада фінансавай камісіі палаты, прыняўшай большасцю 26 галасоў супроць 16 пры двух устрымаўшыхся кампрамісны тэкст, прапанаваны дэлегацыяй левых груп палаты дэпутатаў і адхілены сенатам.

***

ПАРЫЖ, 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Прэзідэнт Францыі даручыў Шатану (былы міністр без партфеля ў кабінеце Блюма, радыкал) сфарміраваць новы кабінет. Шатан у прынцыпе прыняў прапанову.

# ПЛЕНУМ ЦК ІСПАНСКАЙ КОМПАРТЫІ

## СТВАРЭННЕ АДЗІНАЙ ПАРТЫІ ПРОЛЕТАРЫЯТА

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі), 20 чэрвеня. (БЕЛТА). Пленум ЦК іспанскай компартыі прыняў рэзалюцыю па першаму пункту парадку дня — аб стварэнні адзінай партыі пролетарыята. У рэзалюцыі гаворыцца:

«Пленум ЦК іспанскай компартыі, заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад тав. Даларэс Ібаруры (Пасіянарыі) аб задачах палітычнага адзінства пролетарыята, поўнасцю ўхваляе лінію, намечаную ў дакладзе».

Пленум даручыў палітбюро неадкладна звярнуцца да выканкома рабочай сацыялістычнай партыі Іспаніі з прапановай абмеркаваць сумесна асноўныя праграмныя і тактычныя пытанні, а таксама практычныя меры для хутчэйшага зліцця абодвух рабочых партый.

Рэзалюцыя прынята аднагалосна. Галасаванне суправаджалася бурнай авацыяй.

Пленум ЦК іспанскай компартыі паслаў прывітальныя тэлеграмы прэзідэнту Іспанскай рэспублікі Асанья, старшыні совета міністраў Негрыну і ўраду краіны баскаў.

# ІСПАНСКІЯ ТРАЦКІСТЫ—НАДЗЕЙНЫЯ САЮЗНІКІ ФРАНКО

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі). Паведамляюць падрабязнасці выкрытай змовы ў Барселоне і Мадрыдзе. Сярод арыштаваных — афіцэры, якія знаходзіліся ў штабах некаторых брыгад, у органах снабжэння і т. д. У радзе пунктаў рэспубліканскай тэрыторыі трацкісцкая «ПОУМ» непасрэдна інфармавала мяцежных генералаў аб ваенных аперацыях, аб перасоўванні войск, аб узбраенні і аб планах аперацый рэспубліканскай арміі. «ПОУМ» у саюзе з фашысцкай «пятай калонай» мела ў Мадрыдзе ралыёпрыёмнік і ралыёперадатчык. Па ратыё трацкісты інфармавалі пасля кожнай бамбардыроўкі артылерыю мяцежнікаў аб рэзультатах стральбы.

Сярод дакументаў, захваченых у часе апошняга вобыску ў арганізацыі фашысцкай «іспанскай фалангі», ёсць дакумент, у якім гаворыцца: «Нас 400 чалавек, гатовых дзейнічаць, добра ўзброеных, якія на мадрыдскім фронце могуць у спрыяльны момант з'явіцца рухаючай сілай мяцежу. Мы вельмі маем патрэбу ў кіраўніках прапаганды, і па вашаму загаду я адпраўляюся ў Барселону, каб мець сустрэчу з кіраўнікамі «ПОУМ», якія абяцалі мне паслаць у Мадрыд прапагандыстаў. «ПОУМ» будзе таксама як у Барселоне служыць дзейсным і цвёрдым падтрыманнем нашага руху».

# ФРАНЦУЗСКІЯ ПРАПАНОЗЫ ЛОНДАНСКАМУ КАМІТЭТУ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 19 чэрвеня. (БЕЛТА). Як перадае газета «Матэн», міністэрствам замежных спраў дадзены інструкцыі французскаму паслу ў Лондане Корбену дабівацца неадкладнага абмеркавання Камітэтам па неўмяшанню праекта аклікання добраахвотнікаў з Іспаніі і праекта інтэрнацыяналізацыі кантролю. Праект інтэрнацыяналізацыі кантролю, высунуты французскім урадам, прадугледжвае прысутнасць іназемных наглядальнікаў на суднах узбярэжжа, якія непасрэдна ажыццяўляюць морскі кантроль. Французскі ўрад разглядае гэты праект, як найбольш важны пункт, які мае патрэбу ва ўрэгуляванні. Аднак, як перадаюць, калі Камітэт знойдзе іншую форму інтэрнацыяналізацыі кантролю, у прыватнасці, напрыклад, суправаджэнне кантрольных суднаў гідрасамалётамі іншых краін, прастаўленых у Лонданскім камітэце, французскі ўрад пойдзе і на гэту прапанову.

# АНТЫЯПОНСКАЕ ПАЎСТАННЕ У ПРАВІНЦЫІ ЧАХАР ПРАДАЎЖАЕЦЦА

БЭЙПІН (б. сталіца Кітая), 20 чэрвеня. (БЕЛТА). Паводле даных кітайскага друку, антыяпонскае паўстанне ў правінцыі Чахар (Унутраная Манголія — частка Кітая) па-ранейшаму развіваецца. Паўстаннем ахвачаны таксама раёны Лунхуа, Фынынь і Вэйчан у правінцыі Жэхэ.

Газета «Цзіньбао» ўказвае, што кавалерыя Манчжоу-Го, пасланая для падаўлення паўстання, пасля 10-дзённага прабывання ў Доланоры (паўночна-ўсходняя частка правінцыі Чахар) узбунтавалася і раззброена японскімі войскамі.

# СВЯТА ШЧАСЛІВАГА ДЗЯЦІНСТВА

У гэты дзень гарадскі парк імя Горкага быў адданы ў распараджэнне дзяцей. Ва ўсіх кутках звінелі песні аб шчаслівым радасным дзяцінстве. Стройнымі калонамі пад гукі аркестраў удзельнікі свята ўваходзілі ў заліты тысячамі агнёў парк.

7 гадзін вечара. 6.000 дзяцей велізарным поўкругам размясціліся на стадыёне «Харчавік». З пасяховым сканчэннем навучальнага года іх віншавалі прадстаўнік гаркома ЛКСМБ і гарана. Потым слова бярэ вучаніца 7-га класа 20-й школы Рутштэйн. Яна ад імя шчаслівай дзетвары дзякуе вялікую сацыялістычную радзіму, вялікую партыю Леніна—Сталіна за радаснае дзяцінства і за цудоўную будучыню, якая іх чакае.

— Мы дзякуем нашу вялікую радзіму, комуністычную партыю і любімага правадыра таварыша Сталіна за радаснае шчаслівае дзяцінства.

Дзяўчынка гаворыць упэўненым і звонкім голасам. Але вось твар яе становіцца строгім і суровым. Гэта яна гаворыць аб здрадніках нашай сацыялістычнай радзімы, якія хацелі вярнуць дзецям галодна і жабрацкае жыццё.

— Мы бязмежна рады, — гаворыць Рутштэйн. — што гэтыя здраднікі знішчаны. Віншуем і дзякуем за гэта слаўных чэкістаў і вернага сталінца тав. Ежова.

Пры гэтых словах цішыню перарываюць шматтысячнае звонкае «ура».

Дзеці пад дружныя апладысменты прынялі прывітанні правадыру народаў таварышу Сталіну і адважным удзельнікам пералёту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка.

Вучняў сталіцы віталі прыбыўшыя на свята выхаванцы інтэрнацыянальнага дзіцячага дома і выдатнікі вучобы гомельскіх і віцебскіх школ.

Мітынг закончыўся. Дзеці запоўнілі ўсе куткі парка. Усюды яны знаходзілі для сябе забавы. Бесперапынна гралі аркестры. Дзеці гралі, танцавалі і калектыўна развучвалі песні. На спартыўных пляцоўках праходзілі фізкультурныя спаборніцтвы, на рацэ дзесяткі рабят каталіся на лодках. Дзіцячыя каманды — Менск «Дынамаўца», зборная Дзержынска — сустрэліся на футбольным полі. У Зялёным тэатры тысячы дзяцей глядзелі выступленні ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі менскага Дома Чырвонай Арміі. У закрытым летнім тэатры перад юнымі глядачамі выступала Дзяржаўная філармонія БССР і артысты балета. Вялікая праграма была паказана дзецям і ў цырку.

Вечар закончыўся феерверкам.

Так 19 чэрвеня ў гарадскім парку імя Горкага школьнікі Менска адпачылі скончанне навучальнага года. Яны з балзёрымі песнямі разыходзіліся па дамах. Следам за імі несліся пажаданні:

— Добра адпачывайце, дзеці!

— За выдатную вучобу!

Трэба адзначыць, што ў свяце прынялі ўдзел недастатковая колькасць дзяцей. Тлумачыцца гэта тым, што было раздана мала білетаў.

М. ГАРНЫ.
М. ЗЗРОХ.

—o—

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

Актыў Сталінскага раёна па пытанню аб выніках XVI з'езда КП(б)Б адбудзецца 25 чэрвеня 1937 г. у Доме партактыва (вялікая зала).

Т.т. Карасік Х. Х., Шынкарэў І. Н., Сіднеў С. Е., Шах І. П., Баркун А. С., Дымкоў А. Ф. і Баранаў А. М. выклікаюцца ў Сталінскі РК КП(б)Б на ўчотны аддзел.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.


СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Белдзярждрамтэатра | ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКА ТЭАТРА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ
МЯШЧАНЕ

Памяшканне Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатра | Гастролі Украінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра гор. Сталіно
ПЕСНЯ АБ СВЕЧЫЦЫ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ЮНАЦТВА МАКСІМА

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
АРСЕН

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ВЯЛІКАЕ ГОРА
МАЛЕНЬКАЙ ЖАНЧЫНЫ

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ДЗЯЎЧЫНА СПЯШАЕЦЦА НА СПАТКАННЕ

З 22 чэрвеня кіраўніцтва РК міліцыі НКВД БССР
прыступае да абмену
па г. Менску і раёну
ДЗЯРЖАЎНЫХ НУМАРНЫХ ЗНАКАЎ І ЎЧОТНЫХ БІЛЕТАЎ НА АУТАМАШЫНЫ.

Абмен будзе праведзен па аўтагаспадарках на аснове плана. Аўтагаспадаркі аб дні абмену будуць паведамлены.

Абмен дзяржаўных нумарных знакаў і тэхнічных пашпартоў будзе закончан 1 жніўня 1937 г. З гэтага часу старыя нумарныя знакі і ўчотныя білеты анулююцца і абмен аўтазнакаў будзе спынен.

Кіраўніцтва РК міліцыі НКВД БССР.

РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ»
патрэбны машыністкі
на дзённую і вячэрнюю работу.
Звяртацца па тэл № 20-830, ці непасрэдна ў сакратарыят (трэці паверх).

Мясцком і калектыў супрацоўнікаў рэдакцыі і выдавецтва газеты «Звязда» выказваюць спачуванне супрацоўніку рэдакцыі т. САПРЫКІНУ з прычыны смерці
ЯГО БАЦЬКІ.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
СЁННЯ і ШТОДЗЕННА
новы гукавы мастацкі фільм вытворчасці Белдзяржкіно
ДНЯПРО Ў АГНІ
На летняй эстрадзе
ЛЕНІНГРАДСКІ КАНЦЭРТНЫ ДЖАЗ
пад кір. Э. Каржэнеўскага
У праграме Саюзкінажурнал
Паўночны полюс заваяван намі.
Штодзенна 4 сеансы:
Пачатак у 6, 7.30, 9.15 і 11 г.
Канцэрты ў 5.30, 7, 8.45 і 10 г.
Каса ад 1 г. дня.

ДЗЯРЖЦЫРК
(Парк імя Горкага, тэл 22-725).
Сёння і штодзенна —
вялікае цыркавое прадстаўленне
9 гроз аддзялення.
З Леанідавых — прыгуны-акрабаты на падкідных дошках; 2 Слаўскіх — эксцэнтрыкі на свабодным дроце. Палёт пад купалам цырка 7 Эвальдо. Апошнія гастролі 4 Донеман. Ала-Рудрасіраваныя сабачкі і шмат іншых нумароў. Пачатак у 9 гадзін вечара. Каса адкрыта з 12 г. дня да 10 г. веч.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 23 ЧЭРВЕНЯ:
8.30 — «Апошнія паведамленні». 10.30 — перадача для дзяцей 12.30 — завочная партвучоба. 16.05 — літаратурная перадача. 17.00 — канцэрт. 18.50 — завочная партвучоба. 20.30 — мантаж оперы. 21.30 — перадача на яўрэйскай мове. 22.00 — канцэрт. 23.00 — «Апошнія паведамленні» 24.00 — перадача на замежных мовах.

Даверанасць, выданую на імя Герштэйна Самсона Майсеевіча — нам. начальніка Гомельскага аддзялення Белзаенгандля — у студзені месяцы 1937 года за № 1-04 — лічыць несапраўднай.
ГОМВАЕНГАНДАЛЬ.

ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ
МЕНСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА
паведамляе, што летняя заліковая сесія
завочнікаў і экстэрнаў адбудзецца:
для першых курсаў усіх факультэтаў — з 2 ліпеня да 17 жніўня, для другіх, трэціх і чацвертых курсаў усіх факультэтаў — з 5 ліпеня па 5 жніўня.
Пачатак заняткаў на першых курсах — 2 ліпеня ў 9 гадзін раніцы, на старшых курсах — 5 ліпеня ў 9 гадзін раніцы.
Аб прыездзе або непрыездзе неабходна паведаміць інстытут.
Студэнты павінны мець пасцельныя рэчы. Аплачваецца толькі праезд.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ДЗЯРЖСТРАХ БССР
МАЕМАСЦЬ
КАЛГАСАЎ, РАБОЧЫХ, СЛУЖАЧЫХ, КАЛГАСНІКАЎ, АДНААСОБНЫХ СЯЛЯН І ІНШЫХ ГРАМАДЗЯН
МОЖА БЫЦЬ
ЗАСТРАХАВАНА
У ДОБРААХВОТНЫМ ПАРАДКУ НА ПОЎНУЮ КАШТОЎНАСЦЬ.
КАЛГАСЫ МОГУЦЬ СТРАХАВАЦЬ:
ПАСЕВЫ ЗЕРНАВЫХ, БАБОВЫХ І ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР, а таксама ЎРАДЖАЙ САДОЎ, ЯГАДНІКАЎ.
КОНЕЙ, КАРОЎ, ДРОБНУЮ і інш. жывёлу.
ПАБУДОВЫ, АБСТАЛЯВАННЕ, ІНВЕНТАР і інш. маемасць
КАЛГАСНІКІ, РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ і інш. грамадзяне
МОГУЦЬ СТРАХАВАЦЬ:
ХАТНЮЮ МАЕМАСЦЬ і ЖЫВЕЛУ.
За даведкамі і растлумачэннямі трэба звяртацца ў РАЁННЫЯ І ГАРАДСКІЯ СТРАХАВЫЯ ІНСПЕКЦЫІ і к агентам ДЗЯРЖСТРАХА.

23 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба імя Сталіна (раён Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) адбудзецца пасяджэнне
ПЛЕНУМА
МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА
рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.
Парадак дня:
АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ.
ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.
УВАГА: ПАСЕДЖАННЕ ПАРТГРУПЫ ПЛЕНУМА адбудзецца ў гэтым-жа памяшканні ў 6 г. 30 м. вечара.

Сёння, 22 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у Доме тэхнікі (Комсамольская, 25) адбудзецца
ДАКЛАД галоўнага агранома НКЗ БССР т. Беркоўскага
АБ СЕВАЗВАРОТАХ БССР У ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДЦЫ.
Запрашаюцца ўсе сельскагасп адарчыя спецыялісты.
ОРГБЮРО БЕЛ. НІТТ СОЦЗЕМЛЯРОВСТВА.

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ НА ШАСЦІТОМНІК ЗБОРУ ТВОРАЎ ЛЕНІНА
АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ КОГИЗ'а ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ
НА ШАСЦІТОМНІК ЗБОРУ ТВОРАЎ ЛЕНІНА
АБ ТЫМ, ШТО ПАДПІСЧЫКІ, ПА ЯКІХ-НЕБУДЗЬ ПРЫЧЫНАХ НЕ АТРЫМАЎШЫЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ВЫПІСАНЫХ ІМІ КНІГ, ПАВІННЫ ІХ АТРЫМАЦЬ У АДДЗЕЛЕ ПАДПІСКІ КОГИЗ'а—г. МЕНСК, СОВЕЦКАЯ 73 — ДА 5 ЛІПЕНЯ 1937 г.
З ПАДПІСЧЫКАМІ, НЕ АТРЫМАЎШЫМІ КНІГ ДА 5 ЛІПЕНЯ Г. Г., РАЗЛІК БУДЗЕ ЛІЧЫЦЦА ЗАКОНЧАНЫМ, І НІЯКІЯ ПРЭТЭНЗІІ ПРЫМАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.
ПРЫ АТРЫМАННІ КНІГ АБАВЯЗКОВА ПРАД'ЯЎЛЕННЕ КВІТАНЦЫІ.
АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ КОГИЗ'а.

Менскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы тэхнікум
(б. Політэхнікум)
абвяшчае АСЕННІ НАБОР
на 1937—38 навучальны год у колькасці 210 чалавек, у тым ліку 60 чалавек у вячэрні тэхнікум.
Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-будаўнікоў наступных спецыяльнасцей:
дзённы тэхнікум (з адрывам ад вытворчасці) рыхтуе: тэхнікаў па фабрычна-заводскаму будаўніцтву, па ацяпленню і вентыляцыі.
Вячэрні тэхнікум (без адрыву ад вытворчасці) рыхтуе: тэхнікаў па жыллёваму будаўніцтву.
Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы: атэстат аб скончанні пяцігадовай сярэдняй школы (семігодкі), аўтабіяграфію, заяву, даведку аб стане здароўя, метрыку, дзве засведчаныя фотакарткі і на 40 кап паштовых марак.
Іспыты адбудуцца па матэматыцы, фізіцы, беларускай мове, хіміі і грамадазнаўству.
Пачатак іспытаў 5 жніўня. Прыём заяў праводзіцца да 1 жніўня.
Студэнты дзённага тэхнікума забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй, згодна існуючага законапалажэння. Студэнты вячэрняга тэхнікума інтэрнатам і стыпендыяй не забяспечваюцца.
У вячэрні тэхнікум прымаюцца асобы, якія маюць двухгадовы вытворчы стаж па будаўніцтве.
Дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, вул. Карла Маркса, 5, будаўнічы тэхнікум.
ДЫРЭКЦЫЯ.


Уп. Галоўлітбела № К—2134. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К. К. С.